

ТАКОГА ЎЗРОЎНЮ І ПОПЫТУ ДАЎНО НЕ БЫЛО 7

«...РАДЧА — ГЭТА МАЯ ВЁСКА» 15



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СТУДЗЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 1 (29623)

# Гэта наша зямля, гэта наш лёс, гэта наша гісторыя. І толькі мы будзем яе вяршыць

## Навагодні зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа

Дарагія мае суайчыннікі!

Паважаныя госці Беларусі!

Праз некалькі хвілін 2021 год стане яшчэ адной перагорнутай старонкай у жыцці кожнага з нас, у гісторыі нашай краіны.

Гэту гісторыю пішам мы, рэалізуючы задуманае, ажыццяўляючы мары, нараджаючы дзяцей і ствараючы сем'і. І я гавару дзякуй усім, хто пражыў кожны дзень адыходзячага года з любоўю да людзей і роднай зямлі, павагай да памяці свайго народа і нацыянальных традыцый.

Вам — сялянам і рабочым, урачам і настаўнікам, людзям у пагонах, вучоным і дзеячам культуры, журналістам і спартсменам, кіраўнікам і працоўным калектывам.

Менавіта так — карпатліва, дзень за днём — вось ужо 30 гадоў будуецца і квітнее наша суверэнная дзяржава. І згадзіцеся, азіраючыся ў пачатак 90-х, нам ёсць чым ганарыцца. Мы пабудавалі сучасную, стабільную і паспяховую краіну. Насуперак выклікам часу ўпэўнена ставім новыя мэты і ідзём наперад.

Спакойна, без мітусні вырошчваем хлеб, вучым дзяцей, змагаемся за здароўе нацыі, ствараем утульнасць і камфорт у гарадах і вёсках, укараняем у вытворчасць сучасныя тэхналогіі і праектуем аб'екты будучыні.

І мы нямала за гэты год зрабілі: пабудавалі новыя дамы, дарогі, масты, камфартабельныя жылыя мікраараёны, адкрылі школы, дзіцячыя сады, бальніцы, паліклінікі, падарылі краіне яркія творчыя праекты і спартыўныя перамогі.

Усё гэта — вынік вашай працы, вашай самаадданасці. І адказ тым, хто не хоча бачыць на карце свету нашу маладую незалежную дзяржаву.



Фота БелТА.

Але яна будзе! Яшчэ і таму, што на беларускай зямлі і сёння нараджаюцца мужныя людзі, гатовыя працаваць, змагацца, а калі патрэбна — аддаць жыццё за сваю краіну, за свой народ.

Мы заўсёды будзем удзячныя нашым урачам за выратаванне маленькага беларуса, які вынес з агню брата.

Болем і гонарам будуць адгукацца ў нашых сэрцах імёны ваенных лётчыкаў, якія пайшлі ў свой апошні палёт.

Мы будзем выхоўваць сыноў на памяці байца групы «Альфа», які з гонарам выканаў сваё апошняе заданне.

Усе яны — равеснікі нашай незалежнасці, моцныя, смелыя, любячыя сваю Радзіму, сапраўдныя героі сучаснай Беларусі.

Яны сталі ў адзін рад з пакаленнем пераможцаў Вялікай Айчыннай вайны. Пакінулі ў гісторыі свой дастойны прыклад сапраўднага патрыятызму і веліч душы.

Я таксама ганаруся ўсімі, хто праявіў у гэтым годзе такія рэдкія ў наш жорсткі век чалавечнасць, міласэрнасць і сапраўдны гуманізм да людзей, якія страцілі сваю Радзіму і вымушаны шукаць новае прыстанішча.

Мы гэта зрабілі таму, што добра разумеем вялікую каштоўнасць міру, дому і хлеба. Каштоўнасць таго, за што самі змагаліся ў сваёй гісторыі не раз.

Беларусь помніць урокі мінулага. Таму ў адыходзячым годзе мы разам адрадзілі традыцыю адзначаць дату ўз'яднання беларускіх зямель. Дзень народнага адзінства стаў дзяржаўным святам — адным з сімвалаў станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржавы.

Гэта наша зямля, гэта наш лёс, гэта наша гісторыя. І толькі мы будзем яе вяршыць. Гэтага не зменіць, пакуль у кожным з нас гарыць незгасальнае полымя любові да Радзімы.

Ставячы перад сабой новыя мэты, мы ведаем, што не ўсё ў нашых сілах усё прадугадаць, але нам падуладна ў надыходзячым годзе вызначыць для сябе галоўнае.

Гэта тое, што павінна быць у памяці пакаленняў і ў сэрцы кожнага. Гэта нашы рэальныя вытокі — тая жыватворная сіла, якая стагоддзямі жывіла і фарміравала наш духоўны і маральны свет. У ёй і сёння мы чэрпаем мудрасць, вопыт і веру ў сябе.

Таму 2022 год стане Годам гістарычнай памяці.

Паколькі без павагі да мінулага, без традыцый няма будучыні, няма дзяржавы і няма народа.

Дарагія беларусы!

Ад новага, 2022 года нас аддзяляюць лічаныя секунды. Яны нясуць нас у будучыню з велізарнай хуткасцю.

Кожны цяпер успамінае самыя эмацыянальныя імгненні адыходзячага 2021 года. Мы ўдзячныя яму за ўсё добрае, што з намі адбылося, за вопыт, які набылі, за любімых, родных і блізкіх, якія былі апорай у цяжкія, радасныя і шчаслівыя дні.

Гэта і ёсць самае бясцэннае багацце, залог таго, што ўсё задуманае намі, нашы лепшыя чаканні і надзеі здзейсняцца, а Беларусь стане яшчэ прыгажэй і багацей.

Галоўнае — каб усе былі здаровыя, на нашай зямлі быў мір, а ў вашых сем'ях панавалі згода, шчасце і любоў.

Віншую вас са святам! З новым, 2022 годам!

### КОРАТКА

**• Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Георгія Марчука з 75-годдзем.**

• У Мінскай вобласці правядуць эксперымент: медыкам дазволяць выкупляць арэнднае жыллё.

**• Базавая велічыня ў Беларусі павялічылася да Br32.**

• Грамадзянамі Беларусі са жніўня 2021 года стала больш за 2,3 тыс. чалавек, якія прыбылі з Украіны.

ISSN 1990 — 763X

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

## АБ АБ'ЯЎЛЕННІ 2022 ГОДА ГОДАМ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

У мэтах фарміравання аб'ектыўнага стаўлення грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа п а с т а н а ў л я ю:

1. Аб'явіць у Рэспубліцы Беларусь 2022 год Годам гістарычнай памяці.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

з удзелам Генеральнай пракуратуры, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2022 годзе Года гістарычнай памяці;

забяспечыць каардынацыю дзейнасці дзяржаўных органаў, іншых арганізацый па выкананні названага плана.

3. Гэты Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

*1 студзеня 2022 г. № 1 г. Мінск.*



З першых вуснаў

# «НЕ СЦЯГВАЦЬ УСЮ КРАІНУ Ў МІНСК»

**Жыллё для медыкаў, гарады-спадарожнікі, адвод зямель уздоўж другой МКАД — Прэзідэнт Беларусі прыняў з дакладам старшыню Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра ТУРЧЫНА.**

Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў шэраг пытанняў, што датычацца будучыні вёскі Бараўляны. Пасля таго, як яе наведаў Прэзідэнт восенню, абласным уладам неабходна было прыняць рашэнні па забеспячэнні там жыллём медыцынскіх работнікаў.

«Мы варыянты выпрацоўвалі даўно, некаторыя апрабавалі і вырашылі ў гэтым кірунку рухацца. Гэта пра так званыя інтэрнаты, што не горш за камфартабельнае жыллё. Невялікія для пачатку пакоі, унізе дзіцячы садок і ўсё неабходнае. Вы на аснове гэтага павінны былі палічыць і прапрацаваць некаторыя варыянты», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Другая задача для губернатара — аднясенне Бараўлян да горада. Па гэтым пытанні, нагадаў Прэзідэнт, неабходна было параіцца з жыхарамі, бо статус горада нясе за сабой некаторыя змяненні ў плане льгот для грамадзян, якія там пражываюць.

Яшчэ адно пытанне да Аляксандра Турчына — сельская гаспадарка Мінскай вобласці, якая мае патрэбу ў развіцці.

Падчас размовы кіраўнік краіны звярнуў увагу на праблему перанaселенасці сталіцы і Мінскага раёна. Паводле яго, калькасць будаўніцтва жылля ў сталіцы паменшылася, але гэта не значыць, што новыя дамы ў горадзе не з'явяцца наогул. «Тут неабходныя будуць і працоўныя рэсурсы, бо Мінск — буйны прамысловы горад. Але скараціць трэба значна, каб не перанасяляць Мінск і не стварыць нязручнасці жыхарам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў гарадах-спадарожніках сталіцы засяродзіцца не толькі будаўніцтва жылля для мінчан, але і будуць ствараць працоўныя месцы. «Напрыклад, Дзяржынск. Зараз па ім працуеш. Я вясной там буду, пагляджу. У цябе павінен гэта быць як пілотны праект у вобласці. Там працоўных месцаў дастаткова. Неабходна ў парадак прывесці гэты гарадок, і калі трэба, стварыць дадаткова працоўныя месцы», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да губернатара.

Яшчэ адна тэма, на якую звярнуў увагу кіраўнік краіны і прапанаваў для будучага абмеркавання на Усебеларускім народным сходзе, у Палаце прадстаўнікоў, у Савеце Рэспублікі і грамадскасці, — інвестыцыі і будаўніцтва новых тэхналагічных прадпрыемстваў.

«Вызначыліся, пабудавалі і там жа (як гэта робіць БНБК) — жылыя дамы, каб спецыялістаў запрасіць туды і мясцовых жыхароў падцягнуць. Нам трэба сур'ёзна прадумаць, вопыт ёсць, як мы далей будзем развівацца», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, дамаўляліся ствараць працоўныя месцы і ўздоўж другой кальцавой дарогі: аўтазапраўкі, лагістычныя цэнтры, кафэ, майстэрні. Для гэтага кіраўніку краіны неабходна зацвердзіць адмысловы план па развіцці, які падрыхтуюць улады вобласці.

«Мы гэта павінны прапрацаваць і зацвердзіць адзін раз план, бо там неабходны адвод зямель, а гэта справа Прэзідэнта. Неабходны план. Я зацвярджаю адзін раз, і вы там займаецеся, каб не было валакіты і людзі не хадзілі па кожны дазвол, — нагадаў Прэзідэнт. — То-бок без валакіты мы павінны ўздоўж другой кальцавой дарогі ствараць працоўныя месцы для мінчан і мясцовага насельніцтва, што там будзе працаваць».

Прэзідэнт адзначыў, што гэтыя тэрыторыі неабходна абжываць і прыватнікам, і дзяржаўным прадпрыемствам, а ён гатовы дапамагаць у гэтым.

«Неабходна ў план усё ўнесці без лішкаў — зямельных рэсурсаў у нас у Беларусі няма. Вы бачыце, як змагаецца агракамбінат «Дзяржынскі». Яны ўсюды бяруць стратныя гаспадаркі, дзякуй ім, падымаюць да неабходнага ўзроўню. Але гэта кажа пра тое, што няма лішніх зямель сельскагаспадарчага прызначэння», — заключыў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** расказаў журналістам падрабязнасці размовы з Прэзідэнтам.

• **Бараўляны.** Па словах губернатара, аднясенне вёскі да горада пацягне за сабой складанасці, бо мясцовае насельніцтва, як сельскія жыхары, карыстаецца прэферэнцыямі, што могуць страціць.

«Нам трэба больш шырока паглядзець на праблему Мінскага раёна, у тым ліку і ўзаемадзеяння з горадам. Дзесьці паглядзець граніцы і раёна, і горада, каб выпрацаваць аптымальнае рашэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання не на шкоду людзям», — сказаў Аляксандр Турчын.

• **Жыллё для медыкаў.** Старшыня аблвыканкама расказаў, што кіраўнік краіны падтрымаў эксперымент дазволіць медыкам арэнднае жыллё пасля пэўнага перыяду работы (10–15 гадоў) выкупляць у дзяржавы. «Прапанова мае сэнс, бо тым самым мы замацоўваем людзей для працы ў пэўных сферах эканомікі», — адзначыў Аляксандр Турчын. Менавіта ў Бараўлянах падабралі два ўчасткі для будаўніцтва арэнднага жылля, якое магчыма будзе выкупіць.

• **Могілкі.** Губернатар заявіў, што абмяркоўвалі з Прэзідэнтам і вострую праблему сельскіх могілак. Кіраўнік краіны даў даручэнне вызначыць участкі для пашырэння могілак і аператыўна ўнесці адмысловы дакумент на разгляд.

• **Развіццё другой МКАД.** Аляксандр Турчын сказаў, што існуе генеральная схема зямель вакол МКАД, на яе аснове ў хуткім часе неабходна прадставіць Аляксандру Лукашэнку план развіцця, бо ўчасткі запатрабаваны ў інвестараў.

• **Сельская гаспадарка.** Гэту тэму, па словах спікера, будуць абмяркоўваць у хуткім часе на вялікай нарадзе з усімі губернатарамі. Аляксандру Турчыну Прэзідэнт даў канкрэтныя парады, як да яе падрыхтавацца.

# «ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ ЖАНЧЫНЫ МАГЛІ НАРАДЗІЦЬ»

## Напярэдадні Новага года Прэзідэнт Беларусі наведаў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця»

**Гэта самая сучасная ўстанова краіны, якая займаецца перынатальнай дапамогай цяжарным жанчынам і немаўлятам. РНПЦ мае найноўшае высокатэхналагічнае лячэбнае і дыягнастычнае абсталяванне.**

Больш як месяц таму ўведзены ў строй новы корпус анестэзіялогіі, рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі для немаўлят. Гэта адзіны комплекс чацвёртага тэхналагічнага ўзроўню аказання перынатальнай дапамогі. Новы будынак змяшчае трэнінгавы цэнтр дзіцячых урачоў-анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў, лабараторыю экстранных аналізаў, аперацыйны блок для экстранных аператыўных умяшальніцтваў, банк груднога малака, лячэбны блок, палаты-ізалятары, аддзяленне «Банк груднога малака».

Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч расказаў, што смяротнасць нованароджаных у краіне складае 2,6 на 1000 народжаных жывымі ў 2020 годзе.

Прэзідэнт пасля прыезду паслухаў даклад аб аказанні перынатальнай дапамогі ў краіне. Пасля ён азнаёміўся з работай новага корпуса. Аляксандр Лукашэнка наведаў ля-

Па яго словах, вельмі спрыяе павелічэнню нараджальнасці ЭКА. Пэўныя катэгорыі сем'яў маюць права на адну бясплатную спробу гэтай рэпрадуктыўнай працэдуры.

«У гэтым годзе мы ўжо зрабілі 806 (маніпуляцый. — **«Зв.»**). 525 — у РНПЦ, раддом № 2 і Гомель яшчэ на гэта працуюць», — сказаў кіраўнік ведамства.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не так даўно ён меў размову аб рэпрадуктыўных тэхналогіях у краіне з жанчынай супольнасцю. Беларускі скардзіліся на незавершанасць сістэмы, адсутнасць банка генетычнага матэрыялу. Таму заданне для медыкаў — удасканаліць працэсы за першае паўгоддзе 2022 года.

«У нас гэта не развіта. Давайце мы гэтым зоймемся прынцыпова і зробім не горш, чым у Расіі. Гэта мне жанчыны сказалі выпадкова 2-3 дні таму, што ў нас гэта значна адстае. Таму давайце гэта зробім, і зробім вельмі хутка. У першым паўгоддзі будучага года», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Ён акцэнтаваў: неабходна прыняць рашэнні, каб працэдуру ЭКА рабілі ў Беларусі не горш, чым у самых развітых краінах.

«Для канкрэтнай сям'і, жанчыны трагедыя, калі яна не можа нарадзіць ці зацяжарыць сама. Таму давайце развяжам гэтыя пытанні з ЭКА, бо мы паўкроку зрабілі і спыніліся. Давайце зробім банк, будзем рэкламаваць, зацікаўліваць мужыкоў. Павінны зрабіць усё, каб жанчыны маглі нарадзіць», — дадаў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**




Фота БелТА.

Наша пазіцыя

# Пры маўклівым патуранні ўлад

**Пасольства Беларусі выказвае рашучы пратэст у сувязі з нарастаючай радыкалізацыяй антыбеларускай пазіцыі Украіны. Пра гэта заяўлена на сайце беларускай дыпламатычнай місіі.**

«Пасольства Беларусі ва Украіне накіравала ноту ў МЗС Украіны з асуджэннем праведзенага 1 студзеня пры маўклівым папушчальніцтве ўлад Украіны масавага ўдзелу актывістаў зборнай беларускай экстрэмісцкай апазіцыі пад сімволікай беларускіх калабарацыяністаў і прыслужнікаў Трэцяга рэйха ў нацыяналістычным маршы з шырокім асвятленнем у сродку на агульнанацыянальных каналах тэлебачання», — расказалі ў дыпмісіі.

У ноце заяўлена, што «ў сэрцах беларусаў, якія перажылі жахі фашысцкай акупацыі і трагедыю генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адгукаюцца пакутлівым болем абуральныя спробы гераізаваць калабарацыяністаў, забойцаў і карнікаў беларускага народа. Беспакаранае ўшанаванне ідэйных спадкаемцаў крывавых катаў Хатыні і тысяч іншых беларускіх гарадоў і вёсак сваіх «герояў»-забойцаў з'яўляецца ні чым іншым, як абразай памяці нашых продкаў, якія загінулі ў смяротным баі за свабоду і незалежнасць беларускага народа».

«Пасольства выказвае рашучы пратэст у сувязі з нарастаючай радыкалізацыяй антыбеларускай пазіцыі Украіны, якая выяўляецца ў патуранні дэманстратыўнаму ўшанаванню калабарацыяністаў і катаў беларускага народа, і патрабуе ад украінскага боку спыніць спробы гераізаваць злачынствы супраць чалавечнасці, якія не маюць тэрміну даўнасці і не могуць быць дараваныя беларускім народам», — падкрэслілі ў пасольстве.

# «КРАІНА ПРАХОДЗІЦЬ ПРАЗ ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ ЭТАП ПАЛІТЫЧНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ»

**Новы 2022 год толькі пачаўся, але ўжо ўвайшоў у гісторыю Беларусі. Год пачынаецца пад знакам найважнейшай сацыяльна-палітычнай падзеі — змяненняў у Канстытуцыю. Знаёмства з прадстаўленым праектам змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь выклікае ў беларусаў цікавасць, а разам з тым і шэраг пытанняў, на якія трэба адказваць. Менавіта з гэтай мэтай дэпутацкі корпус і экспертная супольнасць сустракаецца з грамадзянамі для абмеркавання новаўвядзенняў у Асноўны Закон краіны. Падобная сустрэча адбылася 30 снежня на базе Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дыскусійная пляцоўка ў рамках Рэспубліканскага асветніцкага праекта «У рэжыме праўды» сабрала каля сотні прадстаўнікоў прадпрыемстваў, устаноў адукацыі і аховы здароўя, сілавых структур, грамадскіх арганізацый, студэнцкага актыву.**



Ганаровым госцем і галоўным спікерам дыскусійнай пляцоўкі выступіў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ**. Таксама ўдзел у дыялогу на актуальныя тэмы прынялі **намеснік старшыні Баранавіцкага гарвыканкама Вадзім ШЧАРБАКОЎ, рэктар БарДУ Аляксандр УНСОВІЧ, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар ХЛАБУКІН і Павел ПАПКО.**

Андрэй Савіных падкрэсліў, што галоўная мэта сустрэчы — абмеркаваць, чым выкліканы змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю, як яны звязаны з геапалітычнымі і эканамічнымі сусветнымі працэсамі і як паўплываюць на будучыню Беларусі. І, канешне, акрэсліць задачы, якія прыйдзецца вырашаць на гэтым шляху. *«Наша краіна праходзіць праз вельмі важны этап палітычнай трансфармацыі. Мы заняліся мадэрнізацыяй палітычнай сістэмы і сістэмы кіравання краінай у цэлым. І, канешне ж, гэты працэс пачынаецца з Канстытуцыі. Але я хачу бы падкрэсліць, што Канстытуцыяй ён не заканчваецца. Нам трэба будзе мадэрнізаваць яшчэ як мінімум 28 асноўных законаў. Гэта вельмі сур'ёзная праца, якая павінна быць праведзена максімум за два гады. Спадзяюся, што мы справімся нават хутчэй. Гэты працэс дазволіць нам стварыць больш кампактную палітычную сістэму кіравання краінай і выйсці на тыя задачы, якія нам ставіць не столькі ўнутраная сітуацыя, колькі наша акружэнне»*, — адзначыў Андрэй Савіных.

Паводле яго слоў, змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон краіны выкліканы патрабаваннем часу: «У цяперашняй сітуацыі, ва ўмовах глабальнага крызісу, пастаяннае абнаўленне і мадэрнізацыя грамадства, і эканомікі, і ўсіх сістэм, якія існуюць у грамадстве, — патрабаванне часу. Мы павінны рухацца хутчэй, быць больш гнуткімі. І задача такіх сустрэч — абмеркаваць механізмы, якія ляжаць у аснове гэтых змяненняў і трансфармацый».

Парламентарый звярнуў увагу, што мадэрнізацыя Асноўнага Закона краіны выклікана дзвюма прычынамі: унутранай і знешняй. Кажучы пра ўнутраную сітуацыю, Андрэй Савіных падкрэсліў неабходнасць навацый, якая ўзнікла ў беларускім грамадстве. Паводле яго слоў, у адрозненне ад іншых постсавецкіх краін, сур'ёзная сацыяльна-палітычная трансфармацыя для насельніцтва Беларусі ў гады незалежнасці праходзіла максімальна мякка. І сёння выспела неабходнасць адаптацыі палітычнай сістэмы да патрабаванняў сучаснага свету. Знешняя прычына перагляду Канстытуцыі заключаецца ў тым, што сёння транснацыянальныя карпарацыі спрабуюць знішчыць ролю нацыянальных дзяржаў для ўсталявання кантролю над міжнароднай супольнасцю. Таму сёння для дзяржавы надзвычай важна захаваць незалежнасць і ўласныя прынцыпы.

## РАШЭННЕ, АРЫЕНТАВАНАЕ НА БУДУЧЫНЮ

Андрэй Савіных акцэнтаваў увагу на тым, што ўсе змяненні ў Асноўным Законе павінны быць прадыктаваны жаданнем беларускага народа. У прадстаўленым праекце Канстытуцыі акрэслены прынцыпы, якія ўплываюць на паўсядзённае жыццё кожнага беларуса. Напрыклад, захоўванне традыцыйных каштоўнасцяў і важная роля сям'і ў развіцці грамадства. Так, у адпаведнасці з прадстаўленым праектам Канстытуцыі, шлюб вызначаецца як саюз мужчыны і жанчыны, і пры гэтым муж і жонка маюць роўныя правы ў шлюбе і сям'і. Важны для кожнага грамадзяніна і прынцып сацыяльнай дзяржавы. Парламентарый патлумачыў, ён заключаецца ў тым, што дзяржава стварае роўныя стартавыя ўмовы для кожнага. Яшчэ адной традыцыйнай каштоўнасцю беларускага народа дэпутат назваў памяць беларускага народа аб сваім гераічным мінулым, якая таксама знайшла адлюстраванне ў абноўленым праекце Канстытуцыі. Артыкул 54 раздзела II сцвярджае, што «Праяўленне патрыятызму, захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь».

Пасля сустрэчы ў Баранавічах Андрэй Савіных пракаментаваў рашэнне аб'явіць 2022 год Годам гістарычнай памяці: «Свет знаходзіцца на этапе сур'ёзнай палітычнай і эканамічнай трансфармацыі. Як паказвае практыка, у існуючай на сусветнай арэне сітуацыі з выпрабаваннямі спраўляюцца лепш за ўсё тыя нацыі, якія добра памятаюць свой гістарычны вопыт, цэняць яго і з павагай ставяцца да фундаментальных каштоўнасцяў уласнай гістарычнай цывілізацыі. Памяць аб мінулым дае магчымасць не проста выжыць, але і забяспечыць далейшы росквіт грамадства. Зразумела, такое рашэнне арыентавана на дабрабыт нашых будучых пакаленняў».

## НЕ ПАВІННА БЫЦЬ АБЫЯКАВАСЦІ І ПАСІЎНАСЦІ

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар ХЛАБУКІН** назваў сустрэчу важнай як для прадстаўнікоў грамадскай супольнасці, так і для саміх дэпутатаў. Паводле яго слоў, гэта дае магчымасць даведацца нешта новае і павысіць сваю палітычную культуру, што асабліва важна ў наш час.

*«Канстытуцыя — закон, які вызначае жыццё грамадства. І, як сцвярджаюць эксперты, кожныя 20—30 гадоў трэба рабіць яго рэвізію. Змяненні ў Асноўны Закон былі выкліканы запытам грамадства. Мноства дыялогавых пляцовак, сустрэч у працоўных калектывах дазволілі сабраць усе прапановы грамадзян дзякуючы Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы, аб'яднаць іх. У абноўленым праекце мы бачым, што больш за 70 прапаноў было фармалізавана. Цяпер наступае вельмі важны этап: нам усім трэба абмеркаваць гатовы праект, каб ён быў поўнасцю ўзважаны і задавальняў усіх, і выносіць яго на рэферэндум. І тут не павінна быць ніякіх раўнадушша і пасіўнасці. Мы ў нашым рэгіёне актыўна працуем над гэтым. З 10 да 21 студзеня дэпутаты раз'едуцца па ўсёй краіне, правядуць мноства сустрэч з моладдзю, грамадскімі арганізацыямі, працоўнымі калектывамі, каб абмеркаваць Асноўны Закон і тым самым развіць палітычную культуру нашага грамадства.*



## ВАЖНЫЯ ПЫТАННІ — ШЧЫРЫЯ АДКАЗЫ

Вялікую цікавасць удзельнікаў дыскусійнай пляцоўкі выклікала абмеркаванне ролі Усебеларускага народнага сходу, якому надаецца канстытуцыйны статус найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, што вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду. Андрэй Савіных звярнуў увагу, што ўнутры краіны існуе мноства канфліктаў і супярэчнасцяў паміж рознымі сацыяльнымі групамі. І няма ні аднаго інстытута, які мэтанакіравана займаўся б іх вырашэннем. «Калі мы створым Усебеларускі народны сход як інстытут, які будзе імкнуцца да мадэрнізацыі адносін паміж рознымі сацыяльнымі групамі, мы атрымаем магутны інстытут сацыяльнага развіцця. Калі мы зможам гэта забяспечыць, то ўбачым масу цудоўных змяненняў у нашым грамадстве», — канстатаваў парламентарый.

Удзельнікі дыскусійнай пляцоўкі абмяркоўвалі іншыя актуальныя пытанні жыцця краіны. Не пакінулі без увагі перапразмеркаванне паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы, дэталёва разбіралі важнасць сацыяльнай накіраванасці дзяржавы.

*Думаю, што мы на правільным шляху. Мы зможам аб'яднацца і разам зрабіць нашу Беларусь, нашыя родныя гарады моцнымі і камфортнымі для жыцця. Прыйсці на рэферэндум — наш грамадзянскі абавязак. Зразумела, што парламентарыі, дзяржаўныя інстытуты дапрацуюць усе нарматыўна-прававыя акты, якія дазволяць нам забяспечыць устойлівае развіццё грамадства і рухацца наперад. Я ўпэўнены, што так і будзе»*, — адзначыў Ігар Хлабукін.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота прэс-службы БарДУ.**

*г. Баранавічы.*

## ДАСЛОЎНА



На рэферэндум неабходна выйсці з канчатковым варыянтам тэксту Канстытуцыі, які не выклікаў бы сумненняў у большасці насельніцтва Беларусі. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала АНТ **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**.

Ён адзначыў, што водгукі насельніцтва на праект патрэбныя і важныя.

***«Мы гатовы ўспрымаць усё. Але хацелася б, каб былі канструктыўныя прапановы. Можа, на этапе падрыхтоўкі мы нешта не ўбачылі, не ўлічылі — вось на гэтым невялікім адрэзку, які застаўся, хацелася б гэта дапрацаваць. Каб выйсці на рэферэндум з гатовым тэкстам, які не выклікаў бы сумненняў у большасці насельніцтва»***, — сказаў ён.

Гаворачы аб канкрэтных палажэннях, ён звярнуў увагу, што па праекце УНС становіцца вышэйшым прадстаўнічым органам улады. «Мяркуецца, што да 1,2 тысячы чалавек будуць выбірацца дэлегатамі на пяцігодку. І на працягу пяці гадоў іх статус будзе захоўвацца», — удакладніў Ігар Сергеенка. І адзначыў шырыню паўнамоцтваў УНС, а таксама яго прадстаўнічы склад.

«Гэткі калектыўны прэзідэнт, які надзяляецца дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі», — прывёў ён аналогію. Падзеі 2020 года, а таксама папярэдніх выбарчых кампаній, паводле слоў Ігара Сергеенкі, падштурхнулі да таго, каб уключыць у праект забарону на замежнае фінансаванне выбарчых кампаній.

А фіксацыя абавязку дзяржавы і грамадзян — захоўваць памяць, гістарычную праўду аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, на думку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, — гэта неабходнасць часу. Паколькі з'яўляецца маладое пакаленне, якое пра падзеі той эпохі даведваецца з розных крыніц, не заўсёды правераных.

## ПРАПАНОВЫ ВІТАЮЦЦА!

**У Савеце Рэспублікі пачне дзейнічаць грамадская прыёмная па абмеркаванні праекта Канстытуцыі**

5 студзеня пачынае дзейнічаць грамадская прыёмная пры Савеце Рэспублікі па абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, кожныя панядзелак, сераду і пятніцу з 11.00 да 17.00 грамадзяне могуць звярнуцца па адрас: г. Мінск, вуліца Кірава, 47.

Калі ўзніклі нейкія пытанні, звяртайцеся па наступных тэлефонах: 8 (017) 327 46 74, 327 46 76.

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

ПРАЕКТ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Падрабязней на pravo.by



У цэнтры ўвагі

# СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ. І НЕ ТОЛЬКІ

## Тэма патрыятызму хвалюе ўсё беларускае грамадства

**Напрыканцы года пастановай урада была зацверджана Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022—2025 гады і склад Рэспубліканскага міжведамаснага каардынацыйнага савета па патрыятычным выхаванні насельніцтва.**

### ДЫСКУСІЙНЫ ТЭРМІН

«Гэта важная праграма. Яна абмяркоўвалася вельмі востра, дыскусійна на стадыі яе прыняцця, — падкрэсліў падчас круглага стала ў БелТА **старшыня праўлення рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН**. — Былі прапанаваны розныя фарматы. Бурна і актыўна ўдзельнічалі нашы грамадскія арганізацыі, часта ўзнікалі спрэчкі. Гэта натуральна, паколькі з праграмай звязаны многія надзеі. Патрыятычнае выхаванне — тэма, якая хвалюе многіх грамадзян — практычна ўсё наша грамадства. Менавіта на патрыятызме завязана і рэалізацыя многіх палажэнняў, якія ўнесены ў якасці змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Ды і ў дзейнай Канстытуцыі для ажыццяўлення асноўных яе палажэнняў неабходны высокі ўзровень патрыятызму ў грамадстве. Хоць сам тэрмін «патрыятызм» застаецца дыскусійным у навуцы. У нашай навуковай практыцы не так шмат работ, якія раскрываюць гэтае паняцце. Мы спадзяёмся, што прыняцце праграмы актывізуе даследаванні ў пытаннях, звязаных з патрыятызмам».

Палітолаг зазначыў, што прыняцце праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва не азначае, што нехта кагосьці спрабуе прымусіць любіць Радзіму. «Такой мэты, відавочна, няма. Размова ідзе аб некаторых канкрэтных мерапрыемствах, якія павінны павысіць грамадзянскую мабілізацыю, грамадзянскую адказнасць, можа быць, нават сфармуляваць асноўныя індыкатары, якія паказваюць, наколькі эфектыўна патрыятычнае выхаванне, — растлумачыў ён. — Дапусцім, адзін з фактараў праявы патрыятызму — прызыў на вайсковую службу, наколькі ахвотна альбо неахвотна ідуць служыць у армію маладыя людзі. Але гэта датычыцца толькі часткі грамадства, дакладней, мужчынскага насельніцтва. Дапамога бацькам, сацыяльная актыўнасць, нават сацыяльная адказнасць бізнесу, — гэта ўсё таксама формы праявы патрыятызму людзей».

Вадзім Гігін канстатаваў: без атмасферы яднання, у добрым сэнсе калектывізму ў нашым грамадстве патрыятычнае выхаванне моладзі будзе немагчымае. «Відавочна павінны быць выпрацаваны вельмі сур'ёзныя сацыялагічныя метады, сацыялагічны інструментарый адсочвання гэтай сітуацыі, установачных даследаванняў, фарміравання навукова абгрунтаваных індыкатараў паспяховасці або непаспяховасці такой работы. Гэта ўзаемадзеянне навуковых устаноў, органаў дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацый, якія апошнім часам праяўляюць усё большую актыўнасць у правядзенні патрыятычных мерапрыемстваў, акцый, якімі гэты год асабліва запомніўся», — дадаў ён.

### НОВЫЯ ЗАДАЧЫ ДЛЯ САЦЫЁЛАГАЎ

Трэба адзначыць, што Праграма распрацоўвалася на аснове статыстычных даных, навуковых даследаванняў, актаў заканадаўства з улікам вынікаў сацыялагічнага апытання насельніцтва, праведзенага Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2021 годзе, а таксама аналітычных матэрыялаў, падрыхтаваных Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў.

Як падкрэслівае **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт Мікалай МЫСЛІВЕЦ**, Праграма патрыятычнага выхавання адпавядае інтарэсам усіх слаёў насельніцтва:

— Пры яе распрацоўцы мы вырашалі прынцыпова новую і складаную задачу. Праграма патрыятычнага выхавання ў прадстаўленым выглядзе — ёсць першы канцэптуальны, глабальны, сур'ёзны і складаны вопыт. Для яе распрацоўкі, безумоўна, былі аб'ектыўныя перадумовы. Развіццё сітуацыі на працягу ўсіх папярэдніх гадоў прывяло ўсіх нас да пэўнай самазаспакоенасці, тады як змены ў грамадстве, нашым асяроддзі патрабавалі адэкватнага аператыўнага рэагавання, працы на апярэджанне. Пры ўсім гэтым праграма прынята своечасова.

Дырэктар Інстытута сацыялогіі падкрэсліў: «Змест праграмы, мяркую, дае ўсе падставы сцвярджаць, што той кантэнт, які ў ёй закладзены, адпавядае інтарэсам абсалютна ўсіх слаёў насельніцтва, грамадства, сацыяльных груп. Ступень кансалідаванасці грамадства, разумення задач, якія трэба будзе вырашаць разам, — гэта ўсё ўключана ў змест і структуру праграмы патрыятычнага выхавання.

Мікалай Мыслівец адзначыў, што маніторынг выканання праграмы — сур'ёзная комплексная задача. «Што датычыцца распрацоўкі канкрэтных паказчыкаў, індыкатараў, якія дадуць магчымасць адсочваць паслядоўнасць, эфектыўнасць выканання праграмы, — гэта тая задача, якую яшчэ трэба будзе вырашаць. Інстытут сацыялогіі на працягу ўсёй гісторыі свайго існавання праводзіць пастаянныя даследаванні ў маніторынгавым рэжыме, у ходзе якіх мы адсочваем, як мяняюцца каштоўнасныя арыенціры ў людзей, жыццёвыя прыярытэты, вывучаецца стаўленне да мінулага і сучаснасці. Апошнім часам быў праведзены шэраг даследаванняў, прысвечаных і такой праблеме, як фарміраванне гістарычнай памяці беларусаў, спадарожныя пытанні ўключаючаюцца ў маніторынгавыя даследаванні. Але, тым не менш, прыняцце такой праграмы вызначае, безумоўна, і новыя задачы, новыя кропкі інтарэсу, увагі да той работы, якую праводзяць сацыёлагі», — дадаў ён.

### КУЛЬТУРНЫ КОД БЕЛАРУСАЎ

«Непарыўнасць сувязі пакаленняў праходзіць чырвонай ніткай у праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва», — такую думку выказаў падчас круглага стала ў БелТА **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай АРОЛ**.

«У культурным кодзе беларусаў закладзена павага да старэйшых. І таму, калі мы гаворым аб праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва, то павінны закрануць пытанне непарыўнасці сувязі пакаленняў. І гэта праходзіць чырвонай ніткай у праграме. У тым ліку там знайшла адлюстраванне тэматыка Вялікай Айчыннай вайны. Таму нельга не сказаць аб падтрымцы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх узрост — 95 гадоў і старэйшы. На сёння ў Беларусі пражывае 2,5 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, але ім на змену прыходзяць ветэраны Узброеных Сіл, у тым ліку тыя, хто ўдзельнічаў у баявых дзеяннях на тэрыторыі Афганістана і іншых дзяржаў. Гэта значыць, змена людзей, якія далей панясуць вось гэтыя ідэі патрыятызму для нашай моладзі», — дадаў Мікалай Арол.

Паводле яго слоў, у праграме патрыятычнага выхавання зададзены толькі вектары, мэты, задачы, асноўныя напрамкі нашай работы, а ўжо кожнае ведамства будзе іх напаўняць зыходзячы са сваёй кампетэнцыі.

### МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫ ПАДЫХОД

«Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва адлюстроўвае сучасныя рэаліі і сацыяльныя практыкі, — такую думку выказала **загадчыца кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Міністэрства адукацыі Алена ІГНАТОВІЧ**. — Праграма распрацавана канцэптуальна. На базе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы была створана міждысцыплінарная навуковая група. У яе склад уваходзілі прадстаўнікі вядучых устаноў вышэйшай адукацыі, навукова-метадычных і навукова-даследчых цэнтраў, прадстаўнікі розных сацыяльна-гуманітарных напрамкаў. У выніку быў распрацаваны канцэптуальны кантэкст праграмы. Упершыню адбылася дастаткова глыбокая аналітыка ўсіх падыходаў да тэрмінаў «патрыятызм», «патрыёт» і «патрыятычнае выхаванне». Трэба сказаць, практыка распрацоўкі такіх дакументаў не з'яўляецца новай, і тое, што гэты дакумент быў распрацаваны ў Беларусі, — заканамерна і абгрунтавана. Але разам з тым быў і шэраг спрэчных момантаў, паколькі мэтазгодна было ўлічыць меркаванні і прапановы прадстаўнікоў розных дзяржаўных органаў, грамадскасці, розных сацыяльных слаёў насельніцтва і ўзроставых груп у тым ліку».

### СІСТЭМА БЕСПЕРАПЫННАГА ВЫХАВАННЯ

Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва — значны крок у згуртаванні беларускага грамадства на падмурку патрыятычных каштоўнасцяў, а значыць, і ўмацаванне нацыянальнай бяспекі. Так лічыць **намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Міністэрства абароны Дзяніс ФЁДАРАЎ**.

«Варта адзначыць, што ініцыятыва неабходнасці распрацоўкі адзінай праграмы патрыятычнага выхавання зыходзіла менавіта ад Узброеных Сіл, якія ўдзельнічаюць у патрыятычным выхаванні дапрызыўнай моладзі, а таксама з'яўляюцца, па сутнасці, школай патрыятызму для вайскоўцаў, бо служба ў арміі аказвае магутны пазітыўны ўплыў на патрыятычную свядомасць юнакоў і ў цэлым на сістэму каштоўнасных арыенціраў, трансфармуючы светапогляд людзей, — падкрэсліў Дзяніс Фёдараў. — Але ў войска хлопцы прыходзяць ва ўзросце 18 гадоў з ужо сфарміраванымі пэўнымі поглядамі, установкамі і сістэмай каштоўнасцяў. І прыходзіць толькі пятая частка маладых людзей прызыўнога ўзросту. Ды і абмяжоўваць патрыятычнае выхаванне катэгорыяй «моладзь» відавочна недапушчальна. Бо фарміравацца патрыятычныя якасці павінны з ранняга дзяцінства і не толькі сям'ёй, але і ўсімі без выключэння сацыяльнымі інстытутамі: школай, каледжам, ВНУ, арміяй, дзяржаўнымі органамі, грамадскімі і іншымі арганізацыямі краіны. А ўмацоўвацца патрыятычная свядомасць павінна на працягу ўсяго жыцця».

Дзяніс Фёдараў дадаў, што ў Беларусі ў пытаннях патрыятычнага выхавання грамадзян робіцца вельмі многа. «Аднак нашы намаганні маюць разрозненыя і нескаардынаваны характар. Зацверджаная праграма патрыятычнага выхавання дае магчымасць скаардынаваць дзеянні выканаўцаў праз дакладны механізм рэалізацыі праграмы пад кіраўніцтвам пастаянна дзеючага калегіяльнага дарадчага органа — Рэспубліканскага міжведамаснага каардынацыйнага савета па патрыятычным выхаванні насельніцтва. Гэта значыць, мы стварылі сістэму бесперапыннага патрыятычнага выхавання».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўрапейцы аказаліся незадаволеныя фарматам перагавораў Пуціна і Байдэна

**Апошняя тэлефонная размова прэзідэнтаў Расіі і ЗША зноў прымусіла Еўропу «адчуць сябе выключанай» з абмеркавання ключавых пытанняў міжнароднага парадку дня, піша нямецкая газета Der Tagesspiegel.**

Нягледзячы на запэўненні ЗША аб цесным супрацоўніцтве з еўрапейскімі калегамі, апошняя дачыненні да перагавораў аб сітуацыі вакол Украіны і гарантыях бяспекі, якіх Расія патрабуе ад Захаду, гаворыцца ў артыкуле.

У сваю чаргу, лідар фракцыі Еўрапейскай народнай партыі ў Еўрапарламенце Манфрэд Вэбер заклікаў уключыць Еўрасаюз у перагаворны працэс аб архітэктуры бяспекі ў якасці аднаго з найбольш зацікаўленых бакоў.

Уладзімір Пуцін і Джо Байдэн у ноч на 31 снежня правялі тэлефонную размову. Па даных Крамля, кіраўнік Белага дома прыгразіў «маштабнымі санкцыямі» з-за сітуацыі з Украінай. Расійскі лідар у адказ заявіў, што гэта было б вялікай памылкай: у такім выпадку можа наступіць поўны разрыў адносін паміж краінамі.

### Даходы Суэцкага канала ў Егіпце ў 2021 годзе дасягнулі $6,3 млрд



Гэта стала самым высокім паказчыкам у гісторыі збудавання, заявіў кіраўнік адміністрацыі воднай артэрыі Усама Рабія, паведамляе ТАСС.

«На працягу 2021 года былі ўстаноўлены новыя і беспрэцэдэнтныя рэкорды за ўсю гісторыю канала, калі гадавы даход дасягнуў найвышэйшага паказчыка — $6,3 млрд», — сказаў Усама Рабія. Гэта на 12,8 % больш у параўнанні з 2020 годам, калі канал прынёс даход у $5,6 млрд.

Бясшлюзавы Суэцкі канал быў адкрыты для суднаходства ў лістападзе 1869 года. Увядзенне яго ў строй дазволіла скараціць марскі шлях з Азіі ў Еўропу як мінімум на 8 тысяч км для гандлёвых і ваенных караблёў, якія раней былі вымушаны агібаць увесь Афрыканскі кантынент. Цяпер даўжыня канала складае каля 160 км, глыбіня — больш за 20 м, што дае магчымасць праходзіць па ім самым буйным у свеце суднам, у тым ліку і найбуйнейшым нафтаналіўным танкерам.

У 2015 годзе была адкрыта новая, 72-кіламетровая ветка канала. Яна заклікана падвоіць прапускную здольнасць транспартнай артэрыі з 49 да 97 суднаў у дзень. Егіпецкія ўлады разлічваюць, што выручка ад эксплуатацыі ўсяго комплексу Суэцкага канала да 2023 года перавысіць $15 млрд у год.

### Украінцы «перабльталі» сабаку Зяленскага з Парашэнкам



Уладзімір Зяленскі апублікаваў на старонцы ў Instagram фатаграфію са спартзалы, якая выклікала бурную рэакцыю з боку падпісчыкаў прэзідэнта.

На здымку ўкраінскі лідар сядзіць на трэнажоры паміж двух сабак.

«Гантэлі стаяць, Пеця спіць, Нора пазяхае. Так выглядае першая трэніроўка пасля Новага года. Усім бадзёрай раніцы!» — напісаў ён.

Некаторыя карыстальнікі задаліся пытаннем, чаму аднаго з гадаванцаў клічуць Пеця. На гэта іншыя выказалі здагадку, што жывёліна названа ў гонар былога прэзідэнта Украіны Пятра Парашэнкі.

У снежні мінулага года Пётр Парашэнка пакінуў Украіну і адправіўся ў дыпламатычнае турнэ, падчас якога былі запланаваны візіты ў Турцыю і Польшчу. Палітык паабяцаў вярнуцца на Радзіму ў сярэдзіне студзеня. Ён паабяцаў адказаць на ўсе абвінавачанні — у краіне супраць яго заведзена некалькі крымінальных спраў, у тым ліку аб дзяржаўнай здрадзе.

# І ДАЎНІНА, І ВІНТАЖ...

## Як у Зэльвенскім раёне пустыя дамы зрабілі музеямі, альбо Пра што нагадваюць старыя рэчы

**Літаральна за год культурныя ўстановы сялянскага быту з'явіліся ва ўсіх сямі сельскіх Саветах Зэльвеншчыны. Унікальнасць аб'ектаў — у іх аўтэнтычнасці. Большасць экспанатаў мае сваю гісторыю, яны належалі мясцовым старажылам ці іх сваякам і былі перададзены ў вясковыя музеі. Некаторыя рэчы знаходзілі ў дамах, якія ішлі пад знос. Ды і самі дамы-музеі доўгі час пуставалі, пакуль кіраўніцтва раёна не прапанавала размясціць у іх экспазіцыі сялянскага быту. З гэтага і пачалася цікавая работа па іх стварэнні.**




Мы пад'ехалі да музея ў аграгарадку Галынка, які адкрыўся літаральна месяц таму. Адразу і не скажаш, што дом з ліку пустых. Акуратная агароджа, фасад пафарбаваны, аконныя рамы з прыгожымі белымі ліштвамі. Гэта потым стала вядома, што дом аднавіўся, пасля таго як было прынята рашэнне адкрыць у ім музей. Хоць, па сённяшніх мерках, сродкі нязначныя — на рамонт затрацілі ўсяго каля 400 рублёў. **Старшыня Галынкаўскага сельсавета Дзмітрый СУХАЛЕТ** паясніў, што абнаўленне выконвалі самі работнікі культуры пры дапамозе мясцовай гаспадаркі.

Экспазіцыя, па словах арганізатараў, фарміравалася з удзелам мясцовых жыхароў, якія прыносілі старыя рэчы, што ў сучасным жыцці не маюць прымянення. Напрыклад, ручная маслабойка. Хто цяпер, нават на вёсцы, карыстаецца гэтай прыладай? Ці тая ж чапяла, якой даставалі з печы гаршкі? А саламяныя кошыкі, дзе захоўвалі сала і кумпякі? Наўрад каму спатрэбіцца і драўляная валізка, якую і падняць цяжка, не тое што кудысьці несці... Ды і многае іншае, што сёння мае хіба толькі этнаграфічны інтарэс. Падумалася, што паасобку гэтыя рэчы трацяць сваю адметнасць. А вось сабраныя ў адным месцы, такія экспанаты ствараюць паўнавартасную карціну сялянскага быту нашых недалёкіх продкаў. Ну, можа, дзядоў і прадзедаў.



— У нежылых дамах, якія зносяцца, знішчаецца ўсё, што там застаецца, — расказвае старшыня сельсавета. — Мы стараемся захаваць гэту гісторыю, каб данесці яе сённяшнім пакаленням. Моладзь многіх прылад папросту не ведае. Таму па нашай мясцовай ініцыятыве было вырашана выбраць адзін такі найлепшы дом і ўкамплектаваць яго рэчамі, якія застаюцца ў тых дамах, што разбіраюцца. Людзі падхапілі ініцыятыву і сталі самі прыносіць рэчы, якія ў іх дзесьці проста пыліліся і лічыліся непатрэбнымі. У музеі яны сталі цікавымі экспанатамі.

Дом, ці па-вясковаму — хата, складаецца з кухні і адносна вялікага пакоя, які выконвае ролю і гасцёўні, і спальні. І тут, трэба сказаць, апаноўвае нейкае пачуццё настальгіі. Дык гэта ж пакой нашых бабуль і дзядуляў! Такі ж ложак, засланы саматканай коўдрай, з-за якой знізу выглядае палоска прасціны з белымі зубцамі, а на ім — падушкі з вышытымі навалачкамі. Саматканыя палавікі. На сцяне — палатняны дыван з аленямі. Вышытыя карціны ў рамках. Стары гадзіннік. Ручная швейная машынка. Круглы стол з плюшавым абрусам і экземплярамі «Огонек». Радыёла і чорна-белы тэлевізар. Партрэты гаспадароў і іх продкаў у маладосці. Магчыма, некаторыя рэчы і сёння можна ўбачыць у вясковых дамах.

Але наўрад ці знойдзецца дом, дзе б трымалі падвесныя калыскі. Іх у музеі некалькі — яны перададзены жыхаркамі Галынкаўскага сельсавета. Як аказалася, праз гэтыя калыскі прайшло не адно пакаленне іх сем'яў. Адну з такіх калысак для новванароджаных жанчыны бралі ў поле і падвешвалі на калках, а самі ішлі працаваць на жніве.

У многіх вяскоўцаў і цяпер у дамах стаяць старыя шафы, якім па 60–70 гадоў. Ёсць такая і ў Галынкаўскім музеі. Дарэчы, тут захавалася і адзенне. Новая льняная мужчынская кашуля. Жаночае паліто, сукенкі.

Знайшлося месца і для старога куфра. Адразу ўспомніўся падобны ў маёй бабулі, дзе яна захоўвала ўсе свае рэчы, у тым ліку і пісьмы з фронту свайго 20-гадовага сына, майго таты, якія знайшліся зусім нядаўна. І хто ведае, якія цікавыя рэчы змяшчаюць у сабе старыя, каваныя куфры дзесьці на лецішчах ды гарышчах?

— У асноўным у музеі прадстаўлены экспанаты 1950—1960-х гадоў, але ёсць больш ранняга перыяду. Праўда, пакуль нам не ўдалося іх дэталізаваць, гэтым яшчэ трэба будзе заняцца, — адзначыў Дзмітрый Сухалет. — І ўвогуле, гэта яшчэ не канчатковы выгляд музея. База экспанатаў будзе папаўняцца, бо жыхары сельсавета абяцалі падзяліцца патрэбнымі для музея рэчамі.

У нейкім сэнсе гэта і пытанне прэстыжу новай установы культуры. Бо каму не хочацца, каб мясцовы музей быў самым адметным і вядомым не толькі ў наваколлі, але і далёка за межамі сельсавета. Пры гэтым старыя рэчы нібыта працягваюць сваё жыццё. Для малодшага пакалення ёсць нагода «пабываць» у гасцях у сваіх бабуль, а старэйшым — сустрэцца са сваім дзяцінствам. Яно, дарэчы, у вёсцы асабліва незабыўнае...

— На перспектыву мы хочам уключыць наш музей у агульны раённы турыстычны маршрут славутасцяў, які атрымаў назву «Да вытокаў», — расказаў старшыня сельсавета. — Гэта будзе маршрут не аднаго дня, а мінімум трох. Каб людзі прыехалі, напрыклад, надвячоркам у пятніцу, пераначавалі, а ў суботу і нядзелю маглі павандраваць па раёне. І для мясцовага бюджэту даход, і госці адкрываюць для сябе нешта новае. Тым больш такі напрамак, як музеі сельскага быту ў пустых дамах, распрацаваны пакуль толькі ў Зэльвенскім раёне.

Работа Галынкаўскага музея будзе пашырацца. Мяркуецца задзейнічаць і падворак — тут уладкуюць дзіцячую пляцоўку. Пакуль у аграгарадку такой атракцыі няма. Яшчэ плануюць праводзіць розныя майстар-класы з удзелам мясцовых і раённых народных майстроў і рамеснікаў.

Новае жыццё старых дамоў падабаецца і месцічам. Яны рады ўнесці свой уклад у стварэнне такіх аўтэнтычных музеяў. Расказваюць, што новы выгляд дома-музея ў Галынцы вельмі парадаваў жанчыну, у якой тут жылі яе дзед з бабкай і вырасла маці. Наведванне дома стала для яе прыемнай сустрэчай з мінулым.

Першы вопыт паказаў, што ёсць сэнс падобную работу працягваць. Так з'явіліся музеі сялянскага побыту ў шэрагу іншых вёсак. Вядома, экспазіцыі іх падобныя, бо якая ж сялянская хата абыходзілася без чыгункоў, збаноў, саматканых ручнікоў і дываноў ды куфраў? І ўсё ж кожны мае нейкую асаблівасць. Як правіла, музей адлюстроўвае быт той мясцовасці, дзе знаходзіцца, і тых людзей, якія тут жылі.

Пра гэта расказаў **намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама Сяргей ЛОЙКА:**

— Экспазіцыю размяшчалі па эпохах — ад старых да пазнейшых. Напрыклад, у адным музеі эпоха 1930—1940-х гадоў, у кагосьці 1950—1960-я, у іншых — 1970-я гады. У Крамяніцы, напрыклад, прадставілі яшчэ і абрадавую тэматыку. Ёсць асобныя выстаўкі ліхтароў, валёнак, ткацтва і вышыўкі.

Інтарэс да незвычайных хат-музеяў сталі праяўляць не толькі мясцовыя жыхары, але і іх дзеці і ўнукі, якія прыязджаюць наведваць родных. Маўляў, дзе тут ваша вясковая славутасць?

— Цяпер экскурсіі праводзяцца бясплатна. Мы хочам, каб ролю экскурсаводаў бралі на сябе мясцовыя жыхары — тыя, хто добра ведае гісторыю вёскі, можа цікава апавядаць. І такія ёсць. У Ярневе, напрыклад, жыве жанчына, якая працавала ў сельсавеце і сама стала збіраць экспанаты. Там, дзе такіх аматараў няма, экскурсіі будуць праводзіць работнікі культуры, — паведаміў суразмоўнік.

На яго думку, разам з захаваннем бытавой спадчыны ў раёне вырашаецца і праблема пустых закінутых дамоў. Падключыліся да праекта і мясцовыя гаспадаркі. Яны дапамагалі будматэрыяламі, фарбай.

Пачыналі з таго, што выбіралі будынак. Тут трэба было ўлічваць некалькі фактараў: каб дом быў безгаспадарны, стаяў недалёка ад дарогі і была магчымасць прыпаркавацца. Начынне сабралі даволі хутка. Нядаўна сюды пачалі вазіць экскурсіі школьнікаў. Ім тут цікава, бо ўсе экспанаты можна памацаць. Ёсць нават элементы квэсту.

Музейныя хаты сталі яшчэ і своеасаблівымі цэнтрамі культуры, што вельмі важна для вёсак, дзе такіх аб'ектаў больш няма. Людзі могуць сабрацца там на нейкае мерапрыемства альбо проста сустрэцца за шклянкай чаю. Дарэчы, музеі ў асноўным стварaліся ў малых вёсках, якія часткова апусцелі. Такі крок вяртае ў іх жыццё.

— Мы плануем зрабіць яшчэ адзін турыстычны маршрут, паспрабуем яго растыражаваць, заказалі турыстычныя карты з тэлефонамі, каб прыцягнуць сюды турыстаў. У раёне дзейнічае 12 турыстычных маршрутаў. Гэта будзе 13-ы, — падзяліўся Сяргей Лойка.

Падчас наведвання музея ў раён прыйшла добрая навіна. Праект музеяў сялянскага побыту стаў пераможцам конкурсу Нацыянальнага агенцтва па турызме «Пазнай Беларусь» у намінацыі «Музей года». Вядома, гэта стане новым стымулам для развіцця справы. Бо так ці інакш, але нас цягне да гэтых немудрагелістых рэчаў у старых вясковых хатах. Яны нібыта звязваюць нас з недалёкім мінулым і такім чынам саграваюць нашу памяць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Надвор'е

# НУ І СЛІЗКА БУДЗЕ...

## Месцамі наліпанне мокрага снегу і моцны парывісты вецер

**Новы год стартаваў з вельмі цёплых пазіцый. А сярэдняя тэмпература паветра за першы яго дзень аказалася на 4—10 градусаў вышэйшая за кліматычную норму. Але ўжо 2 студзеня тэмпературны фон панізіўся, і па поўначы Беларусі было нават на 1—3 градусы халадней за сярэднія шматгадовыя значэнні. Такія тэмпературныя арэлі прывялі да стварэння на большай частцы тэрыторыі краіны галалёдных з'яў. Няўстойлівы характар надвор'я з павышаным тэмпературным фонам захаваецца і на наступным кароткім працоўным тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



А сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які будзе пераходзіць у дождж. Месцамі чакаецца галалёд, слабы туман. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе 1—7 цяпла, па паўночным усходзе — ад нуля да мінус 1 градуса.

Снег, мокры снег і дождж чакаюцца і ў сераду ў многіх раёнах краіны. Па паўночным усходзе — слабая мяцеліца, месцамі наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, удзень па поўдні — да плюс 7 градусаў.

У чацвер, у апошні працоўны дзень на гэтым тыдні, часам чакаецца снег, мокры снег, слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у святочныя выхадныя маразы трохі памацнеюць, ападкі ў асноўным будуць ісці ў выглядзе снегу і мокрага снегу. На дарогах можа быць слізка. У пятніцу ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень у асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег. Месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 градусаў ніжэй за нуль, удзень — ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
Найбольшым здзяйсненнем для краязнаўства апошняга дзесяцігоддзя з'яўляецца адкрыццё краязнаўцамі віртуальнай прасторы і магчымасцяў сацыяльных сетак. Перад гэтым многія краязнаўцы-аматары збіралі ў хатніх умовах розныя папкі з выразкамі з газет, нататкі, успаміны, што ляжалі стосамі і часта ў такім выглядзе заставаліся ляжаць да моманту іх знішчэння нашчадкамі гэтых краязнаўцаў, якім гэтыя папкі былі ўжо без патрэбы. Камп'ютары дазволілі многім збіраць і сістэматызаваць каласальныя аб'ёмы краязнаўчых звестак, больш зручна і хутка знаходзіць патрэбную інфармацыю, апрацоўваць яе і надалей выкарыстоўваць. З'яўленне сацыяльных сетак дазволіла ствараць суполкі па інтарэсах, хутка знаходзіць землякоў, колішніх калег, суседзяў і сваякоў, нават калі яны раз'ехаліся па ўсім свеце, ствараць аматарскія і прафесійныя артыкулы пра свой родны край, дзяліцца фотаздымкамі ў неабмежаванай колькасці, імгненна перасылаць паведамленні і атрымліваць адказ, арганізоўваць дыскусіі па розных краязнаўчых пытаннях. Гэта не толькі істотна дапоўніла інфармацыйнае поле краязнаўчых даследаванняў, прадстаўленае ў большасці артыкуламі ў газетах і асобнымі кніжнымі выданнямі, але і прывяло да пераходу краязнаўства на якасна новы ўзровень.



***— Зусім нядаўна мы бачылі развіццё такога агульнадзяржаўнага праекта, як Год малой радзімы... І гэта доўжылася тры гады. Якім бачыцца галоўны плён у межах гэтай праграмы?***

— Клопат пра патрыятычнае выхаванне, фарміраванне любові да роднага краю, падтрымка мясцовых ініцыятыў і спрыянне захаванню сувязяў грамадзян з родным куточкам успрымаюцца як вельмі пазітыўны і неабходны кірунак дзейнасці любой цывілізаванай дзяржавы. У гэтым кантэксце ініцыятыва правядзення Года малой радзімы заслугоўвае безумоўнай падтрымкі. Важны вынік — стымуляванне сацыякультурнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў мясцовага насельніцтва, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Менавіта ў гэтым галоўны, заўважны і планаваны вынік.

Ёсць і іншы вынік — паступовы і мэтанакіраваны рост у свядомасці грамадства разумення таго, што родная зямля — ці гэта маленькая вёска, ці шматлюдны мегаполіс — з'яўляецца найбліжэйшай і найважнейшай крыніцай, якая на працягу жыцця дае чалавеку натхненне, сілу, падтрымлівае яго.

Мінулае стагоддзе кардынальна памяняла, нават паламала традыцыйны ўклад жыцця беларусаў. У гэты час у нашай краіне адбывалася імклівая ўрбанізацыя: мільёны людзей паслядоўна перасяляліся з вёсак у гарады. Уявіце сабе, яшчэ сто гадоў таму беларусы ў пераважнай большасці былі сялянскім этнасам, большасць людзей была занятая ў сферы сельскай гаспадаркі, нават культурнае жыццё ў асноўным развівалася ў самай цеснай сувязі з каляндарным цыклам сельскагаспадарчых работ. Вясковы ўклад жыцця быў адвечнай формай існавання, сфарміраванай усёй ранейшай шматтысячагадовай традыцыяй у рамках гісторыі беларускага этнасу. І раптам усе традыцыі пераламаліся, засталіся непатрэбнымі, выкінутымі на перыферыю гаспадарчага і культурнага жыцця. Замест хатніх гаспадарак з'явіліся калгасы і саўгасы, потым фермы, якія пры меншай колькасці работнікаў давалі большы вынік. Індустрыялізацыя, механізацыя амаль цалкам выцесніла чалавека, настойліва паказала яму, што патрэбы ў такой колькасці людзей на вёсцы больш няма. Да таго ж героямі найноўшага часу ўсё часцей пачалі станавіцца інжынеры, кіраўнікі заводаў і фабрык, героі тэлеэкранаў, чыноўнікі з вялікіх гарадоў, бізнесмены, прадстаўнікі сучасных і перспектыўных прафесій, у ліку якіх сельскія жыхары сябе бачылі ўсё больш і больш рэдка. У выніку надзеяй і мэтай для многіх вясковых дзетак было «вырвацца з вёскі ў горад», пераехаць падалей ад «адсталага» патрыярхальнага ўкладу дзядоў і бацькоў. І ў многіх атрымлівалася. Як вынік: замест сельскага народа сто гадоў таму беларусы сталі адным з найбольш гарадскіх, урбанізаваных народаў. Амаль кожны пяты жыхар краіны сёння жыве ў сталіцы... У гарадах пражывае большасць насельніцтва краіны. Самае істотнае — нават тыя, хто з вёскі не выехаў, нярэдка ўскладаюць надзею на магчымасць перабрацца ў вялікі горад — ці хоць і не ў вялікі, але ў горад. Страчаны давер да вёскі, да зямлі-карміцелькі, да роднага куточка, які яшчэ нядаўна быў здольны кожнага надзяліць жыццёвай сілаю. У выніку насельніцтва вёсак сёння, асабліва аддаленых, старэе, моладзі становіцца ўсё менш. Найперш з-за пераканання, у многім памылковага, што перспектыў вёска дае зусім няшмат.

Пераламіць такі стэрэатып даволі складана. І не толькі таму, што апошнія дзесяцігоддзі ўсяляк падтрымлівалі яго існаванне, але і таму, што дагэтуль горад фактычна застаецца прывабным і перспектыўным месцам: вышэйшыя заробкі, большы выбар кірункаў прафесійнай дзейнасці, шырэйшыя магчымасці для самарэалізацыі. Калі ж не рабіць нічога, то мы можам страціць вёску, а разам з ёй — сувязь са сваімі каранямі. Думаецца, што такія ініцыятывы, як Год малой радзімы, з'яўляюцца адным з крокаў да перадолення гэтай праблемы.

***— Краязнаўства — заўсёды постаці, арганізатары краязнаўчай работы ў рэгіёнах. Каго б вы вылучылі з сучаснікаў — знакавых персанажаў у беларускім краязнаўстве?***

— Пытанне вельмі складанае, і адказаць на яго, думаецца, я не здолею. Сапраўды, краязнаўства — гэта найперш постаці. І вельмі многае залежыць ад іх актыўнасці, здольнасцяў, падтрымкі. І ўсё ж параўнаць краязнаўцаў між сабою амаль немагчыма. Паспрабую растлумачыць. Калі да цябе ніхто раней не займаўся вывучэннем роднай вёскі, то гэта работа зойме ў цябе вельмі шмат часу і дасць адносна абмежаваны вынік, але навізна, а таму і агульная значнасць гэтай работы будзе высокай. А з іншага боку, пра многія нашы буйныя гарады і асобныя рэгіёны сёння нескладана скласці вялікую і добра ілюстраваную кнігу, бо падобныя даследаванні ўжо даўно і вынікова праводзяцца. Таму — бяры, складай, апрацоўвай і атрымаеш вынік. Ды як можна параўнаць даследчыка палескай вёскі і краязнаўцу, які цікавіцца вялікім горадам? Нават даследчыкаў дзвюх суседніх вёсак між сабою параўнаць складана. А хто лепшы краязнавец: каторы кнігі піша ці які робіць радыёперадачы? Які стварыў краязнаўчую экспазіцыю ў мясцовым музеі ці той, што масава водзіць захапляльныя экскурсіі па сваім рэгіёне? А можа настаўнік сельскай школы, які здолеў прывіць дзецям любоў да роднай вёскі і раёна, даў ім веды пра зямлю бацькоў і тым самым выхаваў сапраўдных патрыётаў? Альбо малады блогер ці стваральнік суполкі ў сецівe, якая сабрала мноства ўраджэнцаў пэўнага населенага пункта, якія масава дзеляцца ўспамінамі, фотаздымкамі, іншымі звесткамі, ствараючы такім чынам жывую і шматгранную гісторыю малой радзімы?

Краязнаўства, па сутнасці, — лакальная ініцыятыва. Далёка не ўсе нават з ліку вельмі яркіх і таленавітых краязнаўцаў вядомыя на нацыянальным узроўні. Магу прыводзіць шмат прыкладаў цудоўных аматараў і прафесіяналаў, якія многае зрабілі для вывучэння і папулярызацыі ведаў пра свой родны горад, вёску ці раён. Аднак для большасці чытачоў «Звязды» альбо «Полымя», «Маладосці», іншай асветніцкай перыёдыкі яны будуць мала вядомымі. У гэтым сэнсе публіка значна лепш ведае дзеячаў-арганізатараў, якія, так бы мовіць, працуюць «на звядзенні», а таксама медыйных асоб. Згадайма Уладзіміра Гілепа і яго паплечнікаў з Беларускага фонду культуры (на чале з Тадэвушам Стружэцкім), якія на працягу ўжо многіх гадоў выдаюць «Краязнаўчую газету». Ёсць таленавітыя фатографы-краязнаўцы, якія аб'ехалі ўсю Беларусь і прымусілі ўсіх захапляцца багаццямі роднай зямлі. Назаву толькі пару імёнаў, разумеючы, што іх спіс можна было б доўга працягваць, — Сяргей Плыткевіч і Анатоль Кляшчук. Згадаем аўтараў папулярных краязнаўчых тэлепраектаў, за якімі з задавальненнем сачылі тысячы, калі не мільёны, гледачоў. Цудоўныя краязнаўчыя тэлепраекты ствараюцца рэгіянальнымі тэлеканаламі...

***— А я назваў бы і пастаўскага настаўніка, пісьменніка Ігара Пракаповіча... Са Слуцка — збіральніка памяці пра Вялікую Айчынную вайну Васіля Тышкевіча... Нельга апошнія семдзесят гадоў краязнаўства Беларусі ўявіць без Адама Мальдзіса...***

**Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# ПЯЦЬ АБЛІЧЧАЎ УЛАДКІ

## Жонка Янкі Купалы не засталася ў цені геніяльнага мужа

**130 гадоў таму нарадзілася незвычайная жанчына, якая назаўсёды ўвайшла ў гісторыю, — Уладзіслава Францаўна Станкевіч. Вядома, першае, што пра яе ўспамінаецца, — жонка Янкі Купалы... Але ж не ўсе жонкі вялікіх людзей уваходзілі ў гісторыю! Уладзіслава Францаўна запомнілася сучаснікам, і вельмі па-рознаму.**

**Давайце адновім яе аблічы з дапамогай дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.**

### АБЛІЧЧА ПЕРШАЕ. СТАНКЕВІЧАНКА

Уладзіслава Францаўна — напалову француженка. Яе маці, Эмілія Манэ, прыехала з Парыжа ў Беларусь працаваць гувернанткай з маленькай дачкой Марыяй на руках. Тут і пабралася шлюбам з ляснічым, беларусам Францам Станкевічам, нарадзіла другую дачку, Уладзіславу.

Паслухаем паэтку Канстанцыю Буйло:

*«Гэта было ў 1910 годзе. У мястэчку Вішнева жыла маці Уладкі — Эмілія Станкевіч. Маленькі чысценькі домік, каля яго садок і некалькі градак, а ў доме — прыгожая, сталая жанчына з пасівелымі валасамі, заплеценымі ў тоўстыя даўгія косы, укладзеныя ў цяжкі пук, які, здавалася, адцягваў назад яе маленькую, зграбную галоўку. Вялікія, уважлівыя вочы ве памятаю і цяпер. Яна была маёй настаўніцай, кіраўніком і другам».*

Дарэчы, першы муж Эміліі быў сваяком мастака Клода Манэ.

Купала часцяком згадваў французскае паходжанне жонкі. Як Уладзіслава Францаўна дасць волю тэмпераменту — жартаваў: «Французы наступаюць».

А вось якой Канстанцыя Буйло першы раз убачыла тую, хто стане яе найбліжэйшай сяброўкай на ўсё жыццё:

*«Уладка тады ўжо працавала ў Вільні, у дзіцячым прытулку, і рэдка прыязджала да маці ў Вішнева. Але аднойчы, веснай, прыйшоўшы як заўсёды на занятікі да маёй настаўніцы, я ўбачыла ў садку, пад расцвіўшымі яблынямі прыгожую маладую дзяўчыну ў доўгай цёмнай сукенцы, з іскрыстымі блакітнымі вачамі, з ясным ружовым тварам, з доўгімі, амаль да кален, пышнымі, залатымі косамі».*

### АБЛІЧЧА ДРУГОЕ. УЛАДКА

Недарэмна я згадала пра тэмперамент... Яго Станкевічанцы было не пазычаць. У 14 гадоў Уладка едзе ў Варшаву, каб стаць, як маці, настаўніцай. У 1908 годзе заканчвае двухгадовыя курсы Стэфаніі Марціэшэўскай і пачынае працаваць у віленскім дзіцячым прытулку.

А яшчэ ўздзельнічае ў беларускім руху. Як піша Алег Лойка ў кнізе «Як агонь, як вада», *«Уладка Станкевічанка танцавала ў Вільні на беларускіх вечарынках... Уладка ў танцы была размашыстай: яна звонка стукала-прыстуквала абцасікамі, шчокі разгараліся ярчэй маку, ярчэй агністага андарака, ярчэй паласатай шырокай спадніцы».*

Былі не толькі вечарынкі... Канстанцыя Буйло кажа наступнае: *«Мы з дзецьмі вучылі беларускія вершы і песні, якія тады забараняліся. Нам дапамагалі сябры. У нас была моцная сувязь з рэдакцыяй «Нашай Нівы», дзе тады працавалі Купала, Бядуля і куды, вядома, вельмі часта прыходзіла Цётка... Мы былі своеасаблівым актывам пры рэдакцыі, і ўсе справы «Нашай нівы» нас жыва цікавілі.*

*У прыюце мы з Уладкай працавалі з захапленнем, бо вельмі любілі дзяцей. Я пісала шмат вершаў. Першым суддзёй заўсёды была Уладка. Яна была звычайна і першым рэдактарам, і крытыкам... Праз год мяне накіравалі настаўніцай у вёску Чаўшклі непадалёку ад Вільні. Уладка прыязджала да мяне і дапамагала мне наладзіць працу сярод сталых сялян і дзяцей».*

У архіве захоўваецца шмат лістоў Уладкі да Косткі.

Почырк Уладкі пазнаеш адразу: незвычайна размашысты, паспешлівы, некаторыя словы скарочаныя, радкі кладуцца абы-як, звычайна ўпоперак лінеек. Пісала яна звычайна на рускай мове.

Вось ліст, які датуецца пачаткам 1940-х, мяркуючы па змесце, напісаны ў эвакуацыі:

*«Дорогая Костка! Получила твое письмо. Спасибо, родная, что ты еще меня не забываешь. Я иногда думаю, что никому я уже не нужна! (Что я слышу каждый день.) Пока новостей у меня мало! Янка сегодня едет на пару недель в Москву. Хорошо, пускай немного встряхнется, полечится! Я буду совершенно одна, но это уже для меня обычная вещ(ь)! Очень тяжело только, что не могу найти здесь себе такой работы, чтобы увлечься ей! Скорей бы ехать ближе к Белоруссии».*


Дорогая Костька!
...
Твоя книжка включена в план на 1954 г.
...

Вось паштоўка ад 22 снежня 1941-га. Уладка піша з Казані ў Маскву:

*«Дорогая Костка! Пишу тебе второй раз! Жду с нетерпением хотя пару хороших слов. Очень скучаю и жалею, что уехала из Москвы! Янка немного хворает. Жду скорой весны! Целую».*

Уладка больш ніколі не пабачыць Янку, прыляціць на ягонае пахаванне з Казані, а самалёт усё будзе затрымлівацца...

З тэмпераментнай Уладкай сябраваць было няпроста: «Прости меня за все, за мои нервы», «за все нехорошее с моей стороны прости». Але яна клапоціцца, каб Костку, мужа якой рэпрэсіравалі, друкавалі, каб яе становішча ў літаратурным свеце ўсталявалася.

*«Сегодня я была на вечере, посвященном великому русскому писателю Гоголю. Была даже в президиуме. Вечер прошел очень хорошо — торжественно. Доклад делал М. Т. Лыньков. Вернувшись домой, пишу тебе письмо. Дорогая Костка, хотя я вредная, но я твой старый друг. Я советую тебе приехать на пленум».*

*«Дела с твоей книгой хороши, я передала дополнительный стихи тов. Майхровичу».*

*«Вчера говорила с главным редактором т. Шераховским, он читает твою поэму. Если положительный даст отзыв, он сказал, что постарается, чтобы её пока напечатали в «Полымя»... Я прошу, чтобы тебе дали хотя 1500 р.»*

Перад Косткай Уладзіслава Францаўна не саромеецца выяўляць пачуцці, да яе скіроўвае вельмі асабістыя просьбы:

*«Как тяжело, что Янки нет в живых. Мне очень и очень одиноко».*

*«Дорогая Костка! Сердечный привет тебе! Думаю, что к Янки годовщине приедешь к нам. Я тебя вызову телеграммой. Имею просьбу, Костка, к тебе. Подъедь в крематорий и посмотри, как там Янки памятник, дай руб. 100 женщине, которая там ухаживает, такая старуха».*

Уладка паведамляе пра сваю руплівую працу: *«готовимся к проведению годовщины с дня напечатания стих. «Мужык» Янки», «завтра еду в Ленинград устанавливать мемориальную доску на доме, где у Эпимаха-Шипилы жил Янка».*



А вось вельмі кранальны ліст 1964 года пасля сустрэчы даўніх сябровак:

*«Спасибо за эту хорошую сердечную атмосферу, в которой я прожила у тебя несколько дней. Я вспоминаю с «умилением» наши купания в холодной ванне, твою квартиру и всё! Даже не сержусь на сумасшедшую гимнастику!!!»*

### АБЛІЧЧА ТРЭЦЯЕ. ЦЁТКА УЛАДЗЯ

Для маладзейшых Уладзіслава Францаўна Луцэвіч назаўсёды засталася цёткай Уладзяй... Вось што ўспамінае паэтка Зінаіда Бандарына. Яна, маленькая, пампавала ў садзе ваду, каб паласкаць бялізну:

*«Бразнула брамка. У двор зайшлі мая маці і незнаёмая маладая жанчына...*

*Адкрыта пазіралі яе шэрыя ласкавыя вочы, па абодва бакі твару віселі вясёлымі абаранкамі светлыя, туга заплеценыя косы, апранута яна была ў белую палатняную сукенку, трымалася надзвычай проста і свабодна. Невялікія, зграбныя, у той жа час моцныя яе рукі, відаць, не ўмелі адпачываць, бо яна тут жа стала дапамагаць мне».*

Тады цётка Уладзя пад канец гасцявання прапанавала жартам маці Зінаіды:

«— Аддайце мне яе за дачку. Пойдзеш?»

І маленькая, звычайна дзікаватая і негаваркая, Зінаіда з радасцю крыкнула: «Пайду!»

Цёткай Уладзяй была Уладзіслава Францаўна для маладых паэтаў, якіх заўсёды ў купалавым «доме пад таполяй» было поўна — чыталі вершы, дыскуціравалі...

### АБЛІЧЧА ЧАЦВЁРТАЕ. КУПАЛІХА

*«Першая сустрэча мая з Янкам Купалам адбылася ў беларускай кнігарні на Завальнай вуліцы, № 7. Даведаўшыся, што Купала знаходзіцца там, нас чалавек 10-15, у тым ліку Цётка, Ядвігін Ш., Бядуля і іншыя, пайшлі яго пабачыць. Калі я першы раз убачыла Янку Купалу, ён мне тады чамусь не спадабаўся. Захапляючыся яго вершамі, я стварыла ў сваім уяўленні незвычайны вобраз паэта. Сваім сціплым выглядам ён нагадваў звычайнага сялянскага хлапца»,* — прызнавалася Уладзіслава Францаўна.

Паўліна Мядзёлка, вялікае і горкае каханне Купалы, запісвае: *«я... была здзіўлена, пабачыўшы ў кватэры Янкі Купалы ў Полацку (люты 1917 г.) Уладзю Станкевічанку ў якасці жонкі Янкі. Я ведала, што яшчэ ў 1914-15 г. Уладзя шалела з кахання да Чэся Родзевіча, а Янка больш чымся абыякава адносіўся да Уладзі, а бывала што і насміхаўся з яе».*

Але ж у 1914-м менавіта Станкевічанцы Купала прысвяціў верш «Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея!» Чаму ж Мядзёлка такая скептычная?

Паўліна ў свой час адпрэчыла каханне Купалы. Пабывала замужам за беларускім палітыкам Тамашом Грыбам, пажыла ў Латвіі, вярнулася ў Савецкі Саюз. І засталася закаханага ў яе сціплага хлапца на вяршыні ягонай славы. А побач з ім — старая знаёмая, якую ніколі ўсур'ёз не ўспрымала як саперніцу. У архіве захоўваецца сшытак успамінаў Мядзёлкі, якія па волі аўтара не павінны быць ніколі і нідзе надрукаванымі. Нямала месца там прысвечана Уладзіславе Станкевічанцы і яе адносінам з Купалам і шмат сказана непрыгожага.

Зразумела, сямейнае жыццё з гарачай Уладкай не было мёдам. Адразу пасля шлюбу, які адбыўся ў 1916 годзе, Купала ў лісце да Эпімах-Шыпілы піша: «Жонка трохі на нервы хварэе... Чыстая бяда, і сама мучаецца, і мне не вялікае шчасце».

Але Уладзіслава гатовая была на ўсё, каб заставацца побач з Янкам. Алег Лойка кажа: *«ва Уладзіславы Францаўны... была засцярога, страх перад кампаніяй, у якую паза домам можа трапіць Янка, кампаніяй, якая можа звесці яе Янку з пуціны, адлучыць яго ад яе, такой вінаватай, што пры ўсёй сваёй гарачай французскай крыві яна не можа стаць маці... Няхай лепш застолле шуміць дома, а не дзе-небудзь, каб за чужым застоллем шукаць Янку, — вырашыла для сябе раз і назаўсёды Уладзіслава Францаўна. І раз і назаўсёды ёю была вызначана гадзіна абеду: чацвёртая гадзіна. І аб'яўляўся аўрал, незвычайная падзея, калі чатыры, а Янкі няма. Пошук пачынаўся самы аператыўны, не без бязлітасных ушчуванняў сагжанаму нарэшце за стол Янку.*

*А дзень часта пачынаўся з таго, што Янка Уладку прасіў:*

*— А ці не схадзіла б ты, не прайшлася па вуліцы, можа, дзе якая сіраціна бядуе?..*

*Калі не знаходзіла сіраціны Уладка, знаходзіў яе Янка, і ў іх доме пад таполяй і днямі, і месяцамі, і гадамі мелі прытулак і ласку вельмі і вельмі многія».*

Прыходзіла ў дом пад таполяй часта і Паўліна Мядзёлка, вяла доўгія бяседы з Янкам. І можна толькі здагадвацца, што адчувала Купаліха і ці так ужо не мела рацыі, калі забараняла яму чытаць госці пэўныя вершы і шчыра абмяркоўваць нейкія тэмы.

### АБЛІЧЧА ПЯТАЕ. УЛАДКА — ЗНАЧЫЦЬ УЛАДА

*«Імя Уладзі як найлепш адпавядала яе характару. Уся паўната ўлады была ў яе руках. Дыктатар ды і толькі!»* — піша пра сяброўку-саперніцу Паўліна Мядзёлка.

Гэтая якасць вельмі спатрэбілася, калі загінуў Купала. Буйло ўспамінае: *«Я не пазнала Уладку. Яна неяк уся ўчарнела, быццам апаленая сонцам. Трымалася мужна, як заўсёды, але гора сушыла яе... Яна адразу пачала збіраць матэрыялы аб Янку, пісьмы яго, фатаграфіі, кнігі».*

У сваёй дзейнасці Уладзіслава Францаўна магла зламаць любыя перашкоды. Паўліна Мядзёлка сведчыць у сваім таемным сшытку:

*«Владка ў гэты час шукала, дзе магла, і збірала матэрыялы для будучага музея Я. Купалы. Яна ў якасці дырэктара музея мела доступ да закрытых фондаў Дзяржбібліятэкі імя У. Леніна.*

*Аднойчы паказала мне выразкі з газет «Наша доля» і «Наша ніва» з вершамі Купалы, газетнымі фота.*

*— Скуль ты гэта раздабыла?* — пытаю.

*— Ловкость рук и никакого мошенства,* — адказвае, і паказала мне лязо брытвачкі, зашчэпленай паміж пальцамі ў кулаку.

*— Слухай,* — кажу здзіўлена, — *за такія справы даюць 10 год, калі агледзяцца.*

*— А хто там глядзець будзе, правяраць? Не баюся гэтага».*

Вось у папцы з фонду Лукі Бэндэ, злога генія Янкі Купалы, нумар газеты «Літаратура і мастацтва» за 29 чэрвеня 1946 года, да 4-х угодкаў смерці Купалы. Вялікі артыкул «Музей Янкі Купалы», аўтар — дырэктар і стваральнік музея Уладзіслава Францаўна Луцэвіч. Купалісе было пра што распавесці: як «паперка за паперкай, фатаграфія за фатаграфіяй, кніга за кнігай» ствараўся фонд, як адшукаліся матэрыялы ў Маскве, Ленінградзе, Вільні, Кіеве, як у матэрыялах, вернутых з Германіі, знайшлося 70 рукапісаў Купалы.

Паўліна Мядзёлка 25 лютага 1960 г. раптам злавіла сябе на думцы, што ёй трэба ў Мінск. Сама сабе здзівілася... Але пачуццё не знікала — трэба на станцыю, трэба ехаць... Каля 10 вечара зайшла суседка і паведаміла пра тэлеграму: памерла Уладзіслава Францаўна.

*«Два гады ўжо Владка была моцна хвора, але да апошняга дня не пакідала працы, хацела хутчэй закончыць будову новага музея і дачакацца яго адкрыцця. Усюды сама мусіла даглядзець, паклапаціцца, не давяраючы сваім памочнікам. І ў гэты апошні дзень свайго жыцця збіралася пайсці на працу. А гадз. 10-ій пайшла ў свой пакой апранацца да выезду, пачула сябе дрэнна, павалілася на падлогу ля свайго ложка і не змагла падняцца».*

У шпіталі Уладзіслава Францаўна прасіла доктара прынесці ёй паперы, каб напісаць якоесь распараджэнне. Доктар прынёс ёй паперы і аловак, ды яна была ўжо нежывая.

Калі скончыўся спектакль у тэатры Янкі Купалы, на сцэну паставілі катафалк, і назаўтра з 10 раніцы пачалася цырымонія развітання. Паўліна Мядзёлка стаяла ў ганаровай варце разам з Ржэцкай. Развітанне з цёткай Уладзяй ператварылася ва ўсенародную акцыю... Нібыта тым людзі кампенсавалі, што не маглі развітацца з яе мужам.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| Продавец | ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», ул. Замковая, 19, 222310, г. Молодечно |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Здание блока вспомогательных цехов**

**(здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) общей площадью 2676,8 кв. м, инв. номер 630/С-79012, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19М.**

**Составные части и принадлежности:** навес на металлических столбах, асфальтное покрытие

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания блока вспомогательных цехов общей площадью 0,6144 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **365 792,26 белорусского рубля (снижение на 20 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов: 10.00 18.01.2022 г.**
**Окончание торгов: 11.00 18.01.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.01.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Бегомльский лесхоз», Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Юхновца, 21, 211730, тел. +375 2157 5 35 54** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника, бывшее в употреблении**
**Месторасположение: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Юхновца, 21**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01240203 72001271 (заводской) | **Машина погрузочно-транспортная МПТ – 461.1 в составе:** - трактор Беларус Л-82.2; рег. знак ВК-2 2184, 2010 г. в.; - Прицеп ПЛ-9-02; рег. знак ВК-2 2183, 2010 г. в. | 32 040,00 |
| 2 | 01240328 72001725 (заводской) | **Машина погрузочно-транспортная МПТ – 461.1 в составе:** - трактор Беларус Л-82.2; рег. знак ВК-2 0044, 2012 г. в.; - прицеп ПЛ-9, рег. знак ВК-2 0045, 2012 г. в. | 36 600,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191021390. **Срок внесения задатка по 02.02.2022 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 04.02.2022.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.02.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 04.01.2022 г.**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 18.01.2022 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-689673 общей площадью 18,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Володько, 30-386. Назначение: помещение транспортного назначения; наименование: гараж в ГСК «Аэродромная-3».
**Начальная цена продажи – 10 000,00 бел. рублей.**
**Задаток – 1 000,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %**

Условия проведения аукциона читать в извещении РУП «Торговый дом «Восточный», опубликованном в газете «Звязда» от 09.11.2021 № 216 (29585)

**Аукцион состоится 18.01.2022 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**
**Окончание приема заявлений – 13.01.2022 в 15.00**

УНП 101127633

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88** |

**Предмет повторного аукциона**
Местоположение – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

**Лот № 1**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| **Складское помещение** | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 524 960,00 бел. руб.** (снижена на 10 %).
**Шаг аукциона – 76 248,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Административное помещение** | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| **Административное помещение** | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 627 480,00 бел. руб.** (снижена на 10 %).
**Шаг аукциона – 31 374,00 бел. руб.**

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию, тел. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение 3 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.10.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.01.2022 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 04.01.2022 до 17.00 18.01.2022,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 19 января 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-181** общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-8627** общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-9721,** общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Капитальное строение с инв. № 311/С-30617** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034**, общая площадь **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **31 518,80** | 1 575,94 | 3 151,88 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»**): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 17 января 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 12.02.2021 г. № 27 (29396).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего
# ОАО «Химчистка и стирка белья»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,** 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится 13 января 2022 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.**

**Предмет аукциона** (наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1** – Изолированное помещение с инв. № 700/D-152301 общей площадью 363,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-2;

- изолированное помещение с инв. № 700/D-152300 общей площадью 156,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-1;

- капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81484 общей площадью 78,0 кв. м; капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81483 общей площадью 128,0 кв. м; капитальное строение (благоустройство территории) с инв. № 700/С-106077 общей площадью 3315,4 кв. м; ворота металлические; ограждение металлическое; эстакада железобетонная, расположенные по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 159.

Начальная цена продажи – 89 100 р. 00 к. (с учетом НДС).
**Начальная цена продажи снижена на 19 %.**

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 часов (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 12 января 2022 года до 13.00.**

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах**
Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by**,
Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

УНП 700008710

# РЭХА НЕЗАКОНЧАНАЙ ВАЙНЫ

**Строчыца — вёска ў Шчомыслiцкiм сельсавеце Мiнскага раёна. Населены пункт знакамiты тым, што тут растуць дубы, якiм, па розных звестках, прыкладна 300 гадоў, а таксама — алеяй 200-гадовых лiп. У гады рэвалюцыйнага руху ў Строчыцы хаваўся ад царскай ахранкi Фелiкс Дзяржынскi. Вядомая Строчыца i тым, што тут знаходзiцца Этнаграфiчны музей беларускага драўлянага дойлiдства, створаны ў 80-х гадах XX стагоддзя.**




## НА РАДЗІМУ ПРАЗ 80 ГАДОЎ

Менавiта ў гэтай адметнай вёсцы ў 1919 годзе ў простай сялянскай сям'i нарадзiўся Iван Байдак. У 1939 годзе Iвана Васiльевiча прызвалi на службу ў рады Чырвонай Армii. У 1941-м ён загiнуў у баях пад Себежам Пскоўскай вобласцi. Яго бацькi пры жыццi спрабавалi атрымаць хоць якую iнфармацыю пра лёс сына, пасылалi запыты ў розныя iнстанцыi. Але Васiлю Станiслававiчу i Вользе Трафiмаўне так i не ўдалося даведацца, што стала з Iванам. I толькi сястра чырвонаармейца Ганна Байдак (Iсачанка) дачакалася звестак пра Iвана. Астанкi салдата былi знойдзены 16 красавiка 2021 года, дзякуючы расiйскiм пошукавым атрадам «Вышыня 102» i «Забыты батальён». Як сведчаць трагiчныя падзеi Вялiкай Айчыннай вайны, менавiта пад Себежам 9-10 лiпеня байцы Савецкай Армii мужна стрымлiвалi наступленне фашысцкiх войскаў, якiя рвалiся ў стратэгiчна важным напрамку — да населенага пункта Iдрыца, дзе знаходзiўся чыгуначны вузел.

Пошукавiкi Расiйскай Федэрацыi ўстанавiлi iмя Iвана Байдака па салдацкiм медальёне, звязалiся з беларускiмi калегамi i паведамiлi пра тое, што стала вядомае месца гiбелi Iвана Байдака. Валанцёры Вольга Шабельнiк i Аляксандр Снiтко звязалiся з сястрой Iвана Васiльевiча, якая жыве ў Строчыцы.

22 чэрвеня адбылася афiцыйная цырымонiя перадачы астанкаў салдата на Радзiму, у якой удзельнiчалi прадстаўнiкi Расiйскай Федэрацыi i Беларусi. Астанкi байца змясцiлi ў крыпту сталiчнага Храма-помнiка ў гонар Усiх Святых i ў памяць аб ахвярах, якiя паслужылi выратаванню нашай Айчыны. Пасля адпявання прах загiнулага быў перазахаваны на малой радзiме ў Строчыцы — 10 лiпеня. Так роўна праз 80 гадоў пасля апошняга яго бою пад Iдрыцай Iван Байдак вярнуўся ў родную вёску i знайшоў спакой на мясцовых могiлках, непадалёку ад таго месца, дзе пахаваны яго бацькi. На цырымонii ўрачыстага пахавання прысутнiчалi землякi, прадстаўнiкi Узброеных Сiл, ветэранскiх арганiзацый, ваенкам Мiнскага раёна Дзмiтрый Гадун. Пазней на магiле героя з'явiлася стэла. Iнiцыятыва ўстаноўкi помнiка належыць раённым уладам i ваеннаму камiсарыяту Мiнскага раёна. Пры вырабе стэлы ўлiчылi пажаданнi сястры Ганны Байдак i пляменнiцы Маргарыты. На стэле ўверсе змешчаны партрэт чырвонаармейца, пад iм праваслаўны крыж i надпiс «Чырвонаармеец Байдак Iван Васiльевiч, 1919—09.07.1941. Загiнуў пры абароне Iдрыцы на Пскоўскай зямлi. Вечная памяць абаронцам Айчыны».

Ганна Байдак амаль што не помнiць брата: калi ён пайшоў на вайну, яна была малой. Але аб iм нагадвае партрэт, якi ўвесь час вiсеў на пачэсным месцы ў адным з пакояў дома. Нiхто з родных не верыў, што Iвана няма ў жывых. Бацькi да апошнiх дзён спадзявалiся, што ён вернецца, бо не загiнуў, а прапаў без вестак — такое паведамленне прыйшло ў 1946 годзе. Як прызналася Ганна Байдак, яна вельмi ўсхвалявалася, калi ёй патэлефанавалi валанцёры, нават не адразу дайшоў сэнс сказанага. Яна вельмi шкадуе, што бацькi не даведалiся аб лёсе сына пры жыццi.

Па словах Маргарыты, калi мацi паведамiлi, што знойдзены астанкi яе брата, яна расхвалявалася ад такой раднасцi i адначасова трагiчнай вестки, у яе падняўся цiск, якнiяк ёй ужо 86 гадоў.

— Адразу ж мы з мамай паехалi ў храм Усiх Святых, паставiлi свечку за спакой душы Iвана яшчэ да таго, як яго астанкi даставiлi з Расii ў крыпту. Дарэчы, у Музеi памяцi храма захоўваецца зямля з месца гiбелi майго дзядзькi, а таксама прыбор для галення, якi знайшлi разам з медальёнам расiйскiя пошукавiкi, — удакладняе мая суразмоўнiца.

Маргарыта расказала, што Iван нарадзiўся ў Строчыцы, а перад вайной яго тата i мацi пераехалi да бацькоў у вёску Машнiца Дзяржынскага раёна, адкуль у 1939 годзе Iвана Васiльевiча прызвалi ў Чырвоную Армiю.

— Наша сям'я вельмi ўдзячная расiйскiм пошукавiкам, беларускiм валанцёрам, уладам Мiнскага раёна, ваенкаму Дзмiтрыю Гадуну за такую ўвагу да памяцi нашага роднага, за дапамогу ва ўстаноўцы помнiка, арганiзацыю перапахавання астанкаў Iвана Васiльевiча, якое прайшло ва ўрачыстай абстаноўцы, з воiнскiмi ўшанаваннямi. Такое не забываецца! А мы яго будзем помнiць заўжды, для нас ён застанецца жывы, — сказала ў канцы Маргарыта Байдак.

## ВЕРНУТЫЯ З НЕБЫЦЦА

У Беларусi аддаецца вялiкая ўвага вяртанню iмён загiнулых падчас Вялiкай Айчыннай вайны, прапаўшых без вестак байцоў, мiрных жыхароў, перапахаванню праху палеглых i, па магчымасцi, пошуку iх сваякоў. У 1992 годзе ў нашай краiне створана ўпраўленне па ўвекавечаннi памяцi абаронцаў Айчыны i ахвяр войнаў Узброеных Сiл.

— У 1995 годзе сфармiраваны 52-i асобны спецыялiзаваны пошукавы батальён (АСПБ), якому 21 снежня споўнiлася 29 гадоў. Гэта першы пошукавы батальён на постсавецкай прасторы. Пазней, у 2006 годзе, у Расii з'явiўся 90-ы асобны спецыяльны пошукавы батальён. З 2015 года мы праводзiм сумесныя пошукавыя работы. Групы расiйскiх воiнаў-пошукавiкаў прыязджаюць для абмену вопытам да нас, а нашы — да iх. У сувязi з пандэмiяй каранавiруса гэтыя кантакты крыху прыпынiлiся, — расказаў **вядучы спецыялiст упраўлення па ўвекавечаннi памяцi абаронцаў Айчыны i ахвяр войнаў Узброеных Сiл Аляксандр ЛУГIН**. — Раскопкi на тэрыторыi Рэспублiкi Беларусь мае права праводзiць 52-i АСПБ, прадстаўнiкi грамадскiх арганiзацый могуць толькi ўдзельнiчаць.

Сёлета пошукавыя работы былi праведзены на 81 аб'екце ў 38 раёнах краiны i Мiнску, у тым лiку на 55 з iх яны прайшлi адпаведна з гадавым планам, якi зацвярджае начальнiк упраўлення па ўвекавечаннi на кожны пошукавы перыяд. Яшчэ на 26 аб'ектах — дадаткова, там, дзе падчас земляных або будаўнiчых работ выяўлены астанкi. I калi пацвярджаецца, што гэта загiнулыя ў гады вайны, 52-i АСПБ аператыўна рэагуе на гэта i прыступае да раскопак пасля атрымання неабходных дакументаў.

— У гэтым годзе выяўлены астанкi 3518 загiнулых, з iх 1390 ваеннаслужачых, 2128 ахвяр вайны з лiку мiрнага насельнiцтва. Сёлета знойдзена таксама сем узнагарод, па якiх устаноўлены звесткi аб шасцi загiнулых. Таксама былi адшуканы 43 медальёны, 15 iмёнаў устаноўлена па ўкладышах, змешчаных унутры iх. Звесткi па двух загiнулых былi выяўлены па падпiсаных асабiстых прадметах i 19 — па дакументах, — працягвае Аляксандр Яўгенавiч. — Гэтыя iмянныя спiсы беззваротных страт змяшчае ў iнтэрнэце Цэнтральны архiў Мiнiстэрства абароны Расiйскай Федэрацыi. Дапусцiм, мы адшукалi медаль, па нумары медаля выявiлi, каму ён належыць. Па iмянных спiсах устанаўлiваем, што ў гэты час, у гэтым месцы, з гэтым чалавекам загiнула яшчэ некалькi.

На цяперашнi момант знойдзены сваякi 15 чалавек з 42 iмёнаў загiнулых, якiя ўстаноўлены. У гэтым годзе астанкi 10 загiнулых перададзены з Беларусi на радзiму: аднаго воiна — ва Украiну, 9 — у Валгаградскую, Маскоўскую, Пензенскую, Самарскую, Тульскую, Ульянаўскую вобласцi i Рэспублiку Карэлiя Расiйскай Федэрацыi.

***— Аляксандр Яўгенавiч, цяжка знайсцi сваякоў герояў?*** — пацiкавiлася ў свайго суразмоўнiка.

— Блiзкiх сваякоў цяпер рэдка знаходзiм. Але здараецца, што яшчэ жывыя дзецi загiнулых. У асноўным адшукваем пляменнiкаў, траюрадных пляменнiкаў, унукаў. Устанаўлiваем iх праз iнтэрнэт, з дапамогай пошукавай супольнасцi, ваенных камiсарыятаў, — адказвае Аляксандр Лугiн.

***— I ўсё ж, калi не ўдалося выявiць радню, дзе перапахаваюць астанкi?***

— Па акце яны перадаюцца ў сельскi або пасялковы Саветы, дзе i знаходзяцца да прыняцця рашэння раённым выканаўчым камiтэтам аб часе i месцы перапахавання. Звычайна астанкi змяшчаюць у брацкую магiлу. Калi такой няма ў населеным пункце, дзе яны былi выяўлены, то — у найблiжэйшы населены пункт, у якiм ёсць воiнскае пахаванне.

***— Цi ёсць падлiкi, колькi загiнулых знойдзена?***

— Яны прыблiзныя. Ёсць звесткi пра тое, колькi чалавек загiнула пры нямецкiм наступленнi, пры вызваленнi Беларусi, падчас акупацыi, колькi трапiла ў палон. Прыкладна каля трох мiльёнаў чалавек загiнула на нашай тэрыторыi. З iх ваеннапалонных каля 810 тысяч, больш за 400 тысяч пры абарончых баях, больш за 200 тысяч пры вызваленнi. Акрамя таго, — яшчэ партызаны, падпольшчыкi, i прыблiзна 1,4-1,5 мiльёна мiрных жыхароў.

Тое, што сёння робяць воiны-пошукавiкi, грамадскiя пошукавiкi, дапамагае захоўваць гiсторыю i памяць пра тых, хто аддаў свае жыццi за свабоду. Не так даўно, напрыклад, знойдзены астанкi 29 байцоў Чырвонай Армii, якiя загiнулi падчас Вялiкай Айчыннай вайны ў баях пад Слаўгарадам Магiлёўскай вобласцi, па асабiстых рэчах i медальёнах устаноўлены iмёны семярых. На ўрачыстую цырымонiю iх пахавання прыехалi сваякi трох знойдзеных байцоў з Расii. Пляменнiк Фёдара Папова расказаў, што 80 гадоў яго дзядзька лiчыўся без вестак знiклым. Iнфармацыю пра яго шукалi рознымi шляхамi. Пляменнiца чырвонаармейца Васiля Самасюка, якая жыве ў Маскве, на пахаваннi таксама расказала, што яго сям'я атрымала дакумент, якi засведчыў: баец прапаў без вестак.

Адышлi ў iншы свет тыя, хто праводзiў сваiх сыноў на фронт. Але жывыя iх унукi, праўнукi, якiя спадзяюцца даведацца, дзе i як скончылiся жыццёвыя шлях iх сваякоў. Як той казаў, надзея памiрае апошняй.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# З ПАКАЛЕННЯ АСВЕТНІКАЎ

**У канцы года краiна страцiла двух волатаў айчыннай культуры — народнага артыста Мiхаiла Казiнца i народнага мастака Васiля Шаранговiча**

Абодва належалi да таго пакалення, стваральны талент якога раскрыўся ў пасляваенны час. Здавалася, што ўся драматычная гiсторыя Беларусi прайшла праз iх свядомасць, абудзiўшы вастрыню пачуццяў i здольнасць уплываць на iншых. Кожны з iх быў асветнiкам у сваёй галiне. Кожны дасягнуў вышынь у прафесii, пашаны — як настаўнiк i кiраўнiк, падзякi — як творца, чыё мастацтва сапраўды служыла народу.



Мiхаiл Антонавiч Казiнец — музыкант i дырыжор, мастацкi кiраўнiк Нацыянальнага акадэмiчнага народнага аркестра Рэспублiкi Беларусь iмя Iосiфа Жыновiча, фактычна стаў спадкаемцам першага кiраўнiка гэтага калектыву. Дзякуючы Мiхаiлу Казiнцу публiка атрымлiвала асалоду ад сустрэч з творамi Юрыя Семянякi, Яўгена Глебава, Генрыха Вагнера, Дзмiтрыя Смольскага, Андрэя Мдзiвані ды iншых айчынных кампазiтараў. Менавiта апантанасць Казiнца дазволiла ажыццявiць маштабныя праекты, якiя выходзiлi за межы выключна музычных, бо былi значнай культурнай падзеяй для краiны наогул: калi ў выкананнi аркестра прагучалi значныя творы легендарных «Песняроў»: рок-паэма «Гусляр» i рок-опера «Песня пра долю». Колькi выдатных праграм, складзеных з любоўю да беларускай песнi, падрыхтаваў аркестр, узняўшы пэрлiны, напiсаныя ў розныя гады на словы нашых выдатных паэтаў, пачынаючы ад Багдановiча, Купалы i Коласа... Нездарма Мiхаiл Казiнец быў уганараваны шэрагам высокiх узнагарод, у лiку якiх Дзяржаўная прэмiя Беларусi, прэмiя «За духоўнае адраджэнне», медаль Францыска Скарыны. Вясковец па нараджэннi, Мiхаiл Антонавiч ведаў, чым зачапiць публiку, каб яна праз музыку адчула душу Беларусi.



Душа Беларусi была галоўнай музай i мастака Васiля Шаранговiча. З маленства сын каваля пачаў выяўляць яе вобразы — гэта перадалося ад мацi, як i павага да той праўды, што захоўвае родная зямля. Голас праўды ён потым будзе шукаць у кнiгах беларускiх пiсьменнiкаў i здолее ўзмацнiць яго сваiмi творамi, стаўшы адным з самых шанаваных кнiжных графiкаў у краiне. Ён здолеў зрабiць так, што, разгарнуўшы кнiгу i ўбачыўшы iлюстрацыю, чалавек адгукаўся эмацыянальна, хацеў зразумець прыроду яе глыбiнi i ўгледзецца ў змест. Сярод многiх кнiг, што выпускалi выдавецтвы ў савецкi час, былi выдатныя творы беларускiх аўтараў, якiя Шаранговiч iлюстраваў гэтак жа выдатна i з гонарам: Адама Мiцкевiча, Максiма Гарэцкага, Максiма Багдановiча, Янкi Купалы, Якуба Коласа, Уладзiмiра Караткевiча... Больш за пяць дзясяткаў праiлюстраваных кнiг, што не страцiлi сваёй актуальнасцi, як i кранальныя вывы да iх. Сёння можна сфармiраваць выстаўку з твораў кнiжнай i станковай графiкi Васiля Шаранговiча, якiя знойдуць водгук у наведвальнiкаў. Высокiя адзнакi на выстаўках, медалi Францыска Скарыны — гэта прызнанне таленту i плёну яго працы. Дзяржаўная прэмiя Беларусi за серыю гравюр «Памяцi вогненных вёсак» — гэта ўзровень грамадскай значнасцi, якога дасягнуў у выяўленчым мастацтве Васiль Пятровiч. Праўда, знайсцi мастацкi вобраз да нацыястваральнага верша Купалы «А хто там iдзе?» — не менш значная грамадская справа.

Такiя творцы, як Казiнец i Шаранговiч, прыйшлi своечасова, калi нацыятворчыя працэсы трансфармавалiся ў дзяржаваўтваральныя. I што не менш iстотна за iх уласную творчасць: яны вызначалi высокi ўзровень прафесiйнай адукацыi Беларусi. Мiхаiл Казiнец узначальваў галоўную навучальную ўстанову ў галiне музыкi ў Беларусi, Васiль Шаранговiч кiраваў Беларускай акадэмiяй мастацтваў. Засталiся творчыя нашчадкi, якiя працягваюць справу майстроў.

**Ларыса ЦIМОШЫК.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении **25 января 2022 года** аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества **в рамках 323-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – Белорусский государственный университет**, тел. +375 (17) 209 55 22 | | | | | |
| 70 | г. Минск, ул. Бобруйская, 5 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Ленинградская, 14 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Ленинградская, 20 (согласно схеме)<br>г. Минск, пр-т Независимости, 4 (согласно схеме) | 33,75 | 3,0 | 213,89 | Площади под размещение вендинговых аппаратов (зерновой кофе, снек-напитки) |
| 71 | г. Минск, ул. Академика Курчатова, 10 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Академика Курчатова, 5 (согласно схеме) | 22,50 | 3,0 | 99,82 | Площади под размещение вендинговых аппаратов (зерновой кофе, снек-напитки) |
| 72 | г. Минск, ул. Академическая, 25 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Кальварийская, 9 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Маркса, 31/1 (согласно схеме)<br>г. Минск, ул. Октябрьская, 8а (согласно схеме) | 27,0 | 3,0 | 171,11 | Площади под размещение вендинговых аппаратов (зерновой кофе, снек-напитки) |
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений**, тел. +375 (17) 225 66 22 | | | | | |
| 73 | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, аг. Залесье, ул. Советская, 18А | 13,0 | 3,0 | 54,93 | Помещение для размещения отделения банка |
| **Арендодатель – государственное объединение «Белорусская железная дорога» Военизированная охрана государственного объединения «Белорусская железная дорога»**, тел.: +375 (17) 225 00 05, 225 02 83 | | | | | |
| 74 | г. Минск, ул. Аннаева, 84Б, 84Б/1, 84Б/2, 84Б/3 | 770,7 | 3,0 | 1302,48 | Комплекс объектов*. **Срок аренды 3 года** |
| | ** Для производства и (или) реализации подакцизных товаров, ювелирных изделий из драгоценных металлов и (или) драгоценных камней; осуществление лотерейной, риэлтерской, страховой деятельности; оказание бытовых услуг (за исключением услуг с применением коэффициента 0,4); разведение и содержание животных; осуществление полиграфической деятельности; оказание услуг по ремонту и обслуживанию автотранспортных средств, машин и оборудования; размещение пункта выдачи товаров; осуществление оптовой и розничной торговли; размещение мастерских; оказание услуг в сфере развлечений и активного отдыха; оказание услуг связи и продажи сопутствующих товаров; размещение офисных помещений; оказание услуг по реставрации мебели; хранение товарно-материальных ценностей и оборудования, за исключением взрывоопасных и легковоспламеняющихся материалов; оказание ритуальных услуг* | | | | |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6, тел. +375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится __25 января 2022 г. в 11.00__ по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 31 декабря 2021 г. по 19 января 2022 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

__Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:__

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) по соответствующему предмету (соответствующим предметам) аукциона на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе **№ 323 от 25.01.2022** по предмету аукциона № ___. Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

**При подаче заявления на участие в аукционе:**

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должна быть засвидетельствована нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 по 31.03.2022 составляет 16,90 рубля;

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

**Телефоны для справок:** __отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58, отдел аренды – + 375 (17) 373 47 29.__

**Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения** указаны в извещении о проведении аукциона, размещенном на сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

## Извещение о проведении **17 января 2022 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** | |
|---|---|
| Капитальное строение с инв. № 600/С-58070 общей площадью 1109,8 кв. м (наименование – профилакторий, ремонтная мастерская; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание профилактория, ремонтной мастерской); капитальное строение с инв. № 600/С-58066 общей площадью 380,7 кв. м (наименование – материально-технический склад; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание материально-технического склада со сторожевой будкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-57540 общей площадью 793,5 кв. м (наименование – ремонтная мастерская; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); составные части и принадлежности: одноэтажное здание ремонтной мастерской смешанной конструкции); капитальное строение с инв. № 600/С-58065 общей площадью 576,3 кв. м (наименование – служебно-бытовой корпус; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание служебно-бытового корпуса с подвалом – (А2/к), навесом – 1, двумя асфальтированными площадками – а, б, бетонным забором – в, сеточным ограждением – г); капитальное строение с инв. № 600/С-58062 общей площадью 285,8 кв. м (наименование – мойка автомобильная; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание мойки автомобильной Д1/к с пристройкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-58069 общей площадью 1223,1 кв. м (наименование – профилакторий для ремонта машин; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание профилактория для ремонта машин); капитальное строение с инв. № 600/С-58060 общей площадью 665,5 кв. м (наименование – автогараж; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание автогаража); капитальное строение с инв. № 600/С-134227 общей площадью 21,4 кв. м (наименование – контрольно-пропускной пункт; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта с тротуарной дорожкой а, крыльцом); капитальное строение с инв. № 600/С-58058 общей площадью 256,3 кв. м (наименование – служебно-бытовой корпус; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой служебно-бытовой корпус с пристройкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-168908 общей площадью 42 кв. м (наименование – трансформаторная подстанция; назначение – сооружение специализированное энергетики; составные части и принадлежности: сооружение трансформаторной подстанции); капитальное строение с инв. № 600/С-131147 протяженностью 236 м (наименование – энергосети; назначение – сооружение специализированное энергетики; составные части и принадлежности – энергосети состоящие из участков энергосетей а1, а2, а3, а4, а5); капитальное строение с инв. № 600/С-131146 протяженностью 254,8 м (наименование – тепловые сети; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства; составные части и принадлежности: тепловые сети); капитальное строение с инв. № 600/С-171338 протяженностью 240,6 м (наименование – внутренние сети водопровода; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; составные части и принадлежности: сооружение внутренних сетей водопровода); капитальное строение с инв. № 600/С-171337 протяженностью 284,3 м (наименование – внутренние сети канализации; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства; составные части и принадлежности: сооружение внутренних сетей канализации | |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,3102 га, кадастровый номер – 623681702601001070 | Начальная цена – 3 099 712,80 бел. руб. без учета НДС |
| Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Кольцевая, 9А, 9А/1, 9А/2, 9А/3, 9А/4, 9А/5, 9А/6, 9А/7, 9А/8, 9А/9 | Сумма задатка – 300 000,00 бел. руб.<br>Обременение – аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **17 января 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.01.2022 по 13.01.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

Памяць

# НЕ ПРОСТА БРАТ

## У Старым Радчы, што на Магілёўшчыне, расійскага акцёра Сяргея Бадрова лічаць сваім і прысвяцілі яму памятны знак

**27 снежня ў аграгарадку Старое Радча ўспаміналі Сяргея Бадрова. Калі б не тая трагедыя ў Паўночнай Асеціі амаль 20-гадовай даўніны, вядомаму тэлевядучаму, артысту, рэжысёру споўнілася б 50 гадоў. Для мужчыны, лічы, самы росквіт. Сяргею было 30, калі яго разам са здымачнай групай накрыла смертаносным ледніком. Пошукі, на жаль, нічога не прынеслі. Уся каманда знікла бясследна. Але ў памяці жыхароў невялічкага населенага пункта ў Беларусі Сяргей па-ранейшаму жывы.**



І ў панядзелак тут урачыста адкрывалі ў гонар яго памятны знак. «Гэта не помнік, — адразу ж папярэдзіў **старшыня Круглянскага райсавета Сяргей ХРАМЦОЎ.** — Помнікі ставяць памерлым, а Сяргея ніхто мёртвым не бачыў. Гэта наша даніна павагі яму як чалавеку і грамадзяніну, нашаму беларуска-расійскаму сяброўству, сімвалам якога ён з'яўляецца, бо, хоць і нарадзіўся ў Расіі, душой быў сапраўдны беларус...»

У 90-я Сяргей Бадроў разам з Аляксандрам Любімавым вёў папулярную праграму «Позірк». Аднойчы там засвяцілася і Старое Радча. Ужо пасля таго, як там пабывала, знайшла на YouTube гэты выпуск амаль 25-гадовай даўніны і ўважліва пераглядзела.

— На мінулым тыдні мы разам з Сяргеем Бадровым, віцэ-прэм'ерам Алегам Сысуевам, музыкантам Гарыкам Сукачовым і з кінарэжысёрам Дзмітрыем Месхіевым абмяркоўвалі, як праводзіць лета. На Сярожу гэта зрабіла незабыўнае ўражанне, і ён адразу ж паехаў да сваёй бабулі ў вёску. Бабуля, дарэчы, за мяжой жыве, — з гэтых інтрыгоўных слоў Аляксандра Любімава пачынаецца відэарэпартаж з Беларусі...

...Прыезд здымачнай групы з Масквы ў Старое Радча зрабіў там сапраўдны пярэпалах. Людзі, здаецца, да канца не разумелі, што іх сапраўды пакажуць па тэлевізары. Яны адкрыта расказвалі пра свае праблемы, шчыра дзяліліся з маскоўскім госцем патаемным. І Сяргей таксама вельмі арганічна ўпісваўся ў вясковую карцінку. На дзедава «ты ж у нас гарадскі» нават крыўдзіўся: «Я толькі ў горадзе нарадзіўся, а так я ваш, вясковы».

Аграгарадком Старое Радча стала ў 2008 годзе, да гэтага была вёска. Дарэчы, у дарэвалюцыйныя часы — маёмасць княгіні Кацярыны Дашкавай, сяброўкі і паплечніцы Кацярыны Вялікай. Ад Круглага да аграгарадка ўсяго пяць кіламетраў язды. **Старшыня Круглянскага сельсавета Валерый ЕРКОВІЧ** арганізаваў экскурсію па населеным пункце і пазнаёміў са стрыечным дзядзькам Сяргея — Мікалаем Сцяпанавічам Шэпелевым. Гэта родны сын таго самага дзеда Сцяпана, які амаль чвэрць стагоддзя таму вучыў перад камерай унука карову Зорку даіць. Дзед Сцяпан некалькі гадоў таму памёр, а вось сын Мікалай пераехаў у горад, бліжэй да цывілізацыі. Працуе ў камунальным прадпрыемстве «Вадбуд».

— Дзіцем Сяргей прыязджаў да нас кожнае лета, — успамінае ён тыя часы. — Разам са сваёй маці Валянцінай Бадровай і бабуляй Лідай. Лідзія Рыгораўна і мая маці — родныя сёстры, толькі пасля вайны маці тут засталася, а цётка паехала ў Маскву. Яна, дарэчы, усю вайну медсястрой прайшла. Ясі дачка, мая стрыечная сястра Валя, ужо ў Маскве нарадзілася, там жа замуж пайшла і Сяргея нарадзіла. Так што карані Бадрова па мацярынскай лініі тут знаходзяцца, у Старой Радчы.

Той дзень, калі Сяргей завітаў у вёску са здымачнай групай, Мікалай Шэпелеў памятае да дробязяў. «Іх было шэсць чалавек, прыехалі да нас на дзвюх машынах, — расказвае ён. — Здымалі ўсё як ёсць, без усякіх там пастановачных сцэн. Сяргей радаваўся сустрэчы з землякамі, таму што болей чым 10 гадоў у вёсцы не быў. З задавальненнем праехаўся вознікам на калёсах, у кузню завітаў. З кожным словам перакінуўся, цікавіўся, як справы. Здымаў, як бабка дровы пілуе; здзіўляўся, што на гэтую справу не знайшлося мужыкоў. А самы цікавы эпізод быў, калі Сяргей спытаўся ў свайго дзеда Сцяпана Лук'янавіча пра самагонны апарат. Той чыстасардэчна прызнаўся: «Канешне, ё». І дзверы ў лазенку, дзе той стаяў, адкрыў. Мы потым баяліся, што міліцыя прыедзе, пакарае. Але ўсё абышлося...»

А які пярэпалах зрабіў яго прыезд у раёне, словамі не перадаць. «Гэта ж цэлая сенсацыя была, — усміхаецца суразмоўнік. — Званяць Шафранскаму (дзевер Мікалая Сцяпанавіча), цікавяцца, што ў цябе за радня там гасціць? А ён у адказ: нічога асаблівага, унук да дзеда прыехаў здымаць фільм. У раёне адразу ж паніка. Ладна б з Магілёва прыехалі або з Мінска, а то з самой Масквы, ды яшчэ з праграмы «Позірк». А праз тыдзень гэтае «кіно» па тэлевізары паказалі».

У памяці Мікалая Шэпелева Сяргей застаўся чалавекам добрай душы і чыстага сэрца, а галоўнае — просты. «І жыхароў Старой Радчы лічыў шчырымі, — адзначае ён. — Казаў, што толькі на такіх вёска і трымаецца».

За свае 30 з хвосцікам Сяргей Бадроў паспеў шмат чаго. Скончыць прэстыжны Маскоўскі ўніверсітэт, стаць кандыдатам мастацтвазнаўства, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі. Гэта не кажучы пра яго неверагодную папулярнасць як кінаакцёра, рэжысёра, сцэнарыста і тэлевядучага. І гэта ўсё ў 30 гадоў! Для пакалення 90-х ён стаў сапраўды братам, бо на фоне тых падзей — чачэнскай вайны, росквіту рэкету і бандытызму, экстрасэнсаў і тэлевізійных псіхатэрапеўтаў — успрымаўся як нешта чыстае і надзейнае. Паспеў стаць бацькам двух дзяцей, апошні з якіх нарадзіўся за месяц да трагедыі ў Паўночнай Асеціі. А яшчэ пакінуць пасля сябе кінахроніку пра сваіх землякоў і малую радзіму, якую так самааддана любіў.



Стрыечны дзядзька Сяргея Мікалай ШЭПЕЛЕЎ.

У той дзень, калі мы прыехалі ў Старую Радчу, выпаў снег. Ціхая прыгожая вёсачка, на вуліцах не відаць людзей, толькі зрэдку чуваць брэх сабак. Доўга не вырашаліся зайсці ў дом, куды прыязджаў Сяргей. Зараз там жывуць чужыя людзі. Але набраліся храбрасці і пагрукаліся. Брамку адкрыў малады чалавек. Калі даведаліся, якая нагода, заўсміхаўся.

— Мы добра ведаем, чый гэта дом, — паведаміў ён. — Крыху падрамантавалі, абнавілі вокны, пакоі. Ён нам без мэблі дастаўся, таму нават не ведаем, як там было пры Бадрове.

Месца, дзе стаіць дом, сапраўды выдатнае. Калі зачыніла за сабой брамку, міжволі залюбавалася вясковым пейзажам: бяскконцы прастор з пералескамі на гарызонце і ціхая рэчка Друць за плотам. Там калісьці купаўся Сяргей Бадроў, улюбёнец і кумір моладзі 90-х. Тут, сярод неабсяжных вясковых палёў і лясоў, праходзілі яго летнія канікулы, якія засталіся яркім успамінам дзяцінства. Лёгкага, шчырага, беслапотнага.

— У дзяцінстве не задумваешся, за што чалавека любіш, — кажа з экрана Сяргей. — Таму правільна гэта робіш...

Велічэзны камень з памятнай шыльдай ляжыць каля дарогі ў цэнтры аграгарадка, там, дзе праходзіць дарога, якая звязвае Магілёўскую і Віцебскую вобласці. Ідэя ўстанавіць яго прыйшла старшыні Круглянскага райвыканкама Сцяпану Палонніку, які вельмі шануе багатую на падзеі і знакамітых людзей гісторыю раёна. Валун знайшлі непадалёк на ворных землях сельгасарганізацыі ААТ «Друць». Яна ж даставіла яго на гэта месца. На камені — фота Сяргея Бадрова — адкрыты твар, шчырая ўсмешка. І яго словы: «...Радча — гэта мая вёска. Я сюды ўлетку да бабулі ездзіў, калі маленькі быў. Мне вельмі прыемна, калі людзі адкрыта радуюцца. Хочацца з імі размаўляць. Гэта выдатна...»

— Даведаўшыся, што Сяргей знік у той Кармадонскай цясніне, былі ў шоку, — прызнаецца стрыечны дзядзька Сяргея. — Увесь час трымалі сувязь з яго маскоўскай раднёй. У асноўным з Лідзіяй Рыгораўнай. Валянціна, яго маці, вельмі цяжка перажывала тыя падзеі і зусім не ішла на кантакт. Усе да апошняга спадзяваліся, што яго знойдуць. На жаль, цуду не адбылося...

Мікалай Сцяпанавіч цяжка ўздыхае і прагягвае: «Мы Сяргея не забываем і фільм час ад часу глядзім. Сястру вельмі шкада, у яе Сяргей адзіны сын быў. Пасля трагедыі яна з бацькам Сяргея развялася, ён потым з'ехаў у Амерыку. А Валянціна і зараз жыве ў кватэры сваёй маці. Ёй ужо за 70».

Дарэчы, ад памятнага каменя ў аграгарадку Старое Радча да дома, куды на лета прыязджаў Сяргей, рукой падаць. Адразу за каменем — малочна-таварная ферма. Насупраць крама, сельскі цэнтр культуры. Тут у панядзелак адбыўся вечар памяці, прысвечаны Сяргею Бадрову, дзе родныя і знаёмыя дзяліліся ўспамінамі, была арганізавана фотавыстава, прагляд той самай відэаздымкі для праграмы «Позірк». Памяць не падуладна гадам. Нездарма каля памятнага знака яшчэ да яго адкрыцця з'явіліся кветкі.

— Людзі праязджаюць і прыпыняюцца, — сведчыць Валерый Ерковіч. — Здзіўляюцца, калі бачаць на камені здымак Сяргея Бадрова. Мала хто ведае, што яго карані знаходзяцца ў Старой Радчы. Шкада, што яго жыццё абарвалася так раптоўна, вельмі таленавіты быў. Жыў вельмі мала, а ў памяці застаўся...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

*Круглянскі раён.*

---

Анонс

## СТВАРЭННЕ АГУЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ: БЕЛАРУСЬ — КІТАЙ

**12 студзеня ў Мінску ў Рэспубліканскім інстытуце кітаязнаўства імя Канфуцыя пройдзе міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Тры дзесяцігоддзі беларуска-кітайскіх адносін і стварэнне супольнасці адзінага лёсу чалавецтва».**

Арганізатары праекта — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Таварыства дружбы «Беларусь — Кітай».

Мяркуецца, што возьмуць удзел у канферэнцыі і выступяць з прывітальнымі словамі першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, сустаршыня Беларуска-Кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы ў 2020 г. Мікалай СНАПКОЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь СЕ СЯАЮН, міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір МАКЕЙ, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі Ніна ІВАНОВА.

На канферэнцыі будуць абмеркаваны этапы і вынікі развіцця беларуска-кітайскіх адносін у палітычнай сферы, усталяванне і развіццё навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, гісторыя развіцця крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая і іншыя актуаліі беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў апошнія дзесяцігоддзі.

**Раман СЭРВАЧ.**

---

Навінкі кнігарні

## Кніжны падарунак падлеткам — ад «Звязды»

**У Выдавецкім доме «Звязда» ў першы месяц новага 2022 года — кніжная навінка: да юнага чытача прыходзіць першае выданне аповесці лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Алега ЖДАНА «Прынцэса».**

У кнізе ідзе размова пра тыя клопаты, праблемы, якімі жывуць падлеткі — хлопчыкі і дзяўчынкі, па ўзросце — вучні сярэдніх класаў агульнаадукацыйнай школы. Гэта ўжо другое выданне аповесці. Першае ўбачыла свет у 2021 годзе і даволі хутка разышлося па бібліятэках краіны, не знайсці яго і ў кнігарнях.

Нагадаем, што Алег Ждан нарадзіўся ў 1938 годзе ў Смаленску. Жыў і вучыўся на Магілёўшчыне, у Мсціслаўе. Закончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. З першым апавяданнем выступіў у газеце «Литературная Россия» ў 1963 годзе. У 1969 годзе закончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Аўтар многіх кніг прозы, адрасаваных даросламу і юнаму чытачу. Аповесць «Прынцэса» ў Выдавецкім доме «Звязда» — кніга на беларускай мове. Пераклад ажыццявіў Алесь Карлюкевіч.

Доўгі час Алег Ждан працаваў рэдактарам аддзела прозы. Дзякуючы яго таленавітай рэдактарскай рабоце да чытача прыйшлі творы многіх цікавых празаікаў. Сярод твораў Алега Ждана — раманы і аповесці, апавяданні «Знаёмы», «У гасцях і дома», «Рысы і аблічча», «Князь Мсціслаўскі», «Па абодва бакі праходной», «Геній», «Самастойнае жыццё»... Па творах вядомага пісьменніка зняты мастацкія фільмы — «Сумленны, разумны, нежанаты» і «Хочаце любіце, хочаце — не».

**Сяргей ШЫЧКО.**

Спорт-тайм: наш фармат

# З НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ І ПЛАНАМІ

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем, як пачаўся спартыўны год

**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** Зборная Беларусі выступіла на юнацкім чэмпіянаце Еўропы па шахматах, дзе заваявала 24 медалі. Чэмпіёнамі Еўропы сталі Аляксандра Тарасенка, Ксенія Зелянцова, Арцём Стрыбук.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларускі тэнісіст Ягор Герасімаў (113-ы нумар сусветнага рэйтынгу) выйшаў у асноўную сетку катэгорыі ATP-250 у аўстралійскай Аделаідзе з прызавым фондам $521 тыс. У вырашальным матчы кваліфікацыі беларус абыграў прадстаўніка Малдовы Раду Албота. Вынік сустрэчы — 6:3, 0:6, 6:2. У 1/16 фіналу жаночага турніру катэгорыі WTA-500 у Адэлаідзе беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (27) сустрэнецца з іспанскай тэнісісткай Паўлай Бадасай (8). Другая ракетка планеты беларуска Арына Сабаленка пачне выступленне з 1/8 фіналу. Яе апаненткай будзе пераможца сустрэчы паміж французанкай Хлоэ Пакэ (119) і славенкай Каяй Юван (100).

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія баскетбалісты сталі пераможцамі 24-га міжнароднага турніру памяці Уладзіміра Рыжанкова, у якім удзельнічалі каманды юнакоў і дзяўчат U-16. Сярод дзяўчат перамагла каманда «Беларусь-2» пад кіраўніцтвам Вікторыі Дацун. Сярэбраныя ўзнагароды заваявалі баскетбалісткі юнацкай зборнай Расіі, бронзавыя — прадстаўніцы расійскага клуба «Трынта» з Масквы.

У спаборніцтвах юнакоў перамогу святкавала першая зборная Беларусі. На другім месцы — каманда Грузіі, на трэцім — прадстаўнікі Азербайджана. Самымі лепшымі ігракамі турніру прызнаны Кірыл Баранчэеў («Беларусь-1») і Паліна Дамянюк («Беларусь-2»). Акрамя таго, Нацыянальны алімпійскі камітэт і Беларуская федэрацыя баскетбола ўзнагародзілі найлепшых спартсменаў па гульнявых амплуа.

Турнір памяці першага міністра спорту і турызму і першага прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Уладзіміра Рыжанкова быў заснаваны ў 1996 годзе.

**АДМЕНА ТЫДНЯ.** Міжнародная федэрацыя хакея (ІІХФ) прыняла рашэнне адмяніць маладзёжны чэмпіянат свету, які стартаваў у Канадзе 26 снежня. Гэта звязана са станоўчымі вынікамі ПЦР-тэстаў у гульцоў каманды ЗША, Чэхіі і Расіі. Кіраўнік ІІХФ Люк Тардыф адзначыў, што намаганняў арганізатараў аказалася недастаткова, каб забяспечыць камандам неабходныя ўмовы для праспякавага правядзення турніру. Цяпер патрэбны час, каб бяспечна даставіць усіх хакеістаў і персанал зборных дадому. Наступны маладзёжны чэмпіянат планеты пройдзе праз год у расійскіх Новасібірску і Омску. Сярод 11 яго ўдзельнікаў будзе і беларуская «маладзёжка», якая нядаўна ў Даніі паспяхова правяла сусветнае першынство ў дывізіёне ІА, заняўшы першае месца.

**ГУЛЬЦЫ ТЫДНЯ.** Анастасія Верамеенка 12-ы раз прызнана найлепшай баскетбалісткай года ў Беларусі па выніках традыцыйнага перадна-вагоднягa апытання спецыялістаў і журналістаў, якое праводзіць газета «Прессбол». Цэнтравая нацыянальнай зборнай і «Гарызонта» атрымала 85 галасоў рэспандэнтаў. У мужчын найлепшым баскетбалістам краіны названы форвард іспанскага «Бургаса» і беларускай зборнай Максім Салаш, за якога прагаласавалі 60 удзельнікаў апытання. Для яго гэта другое падобнае прызнанне.

Сярод трэнераў найлепшымі сталі настаўнікі жаночай зборнай Беларусі і «Гарызонта» Наталля Трафімава, рулявы «Цмокі-Мінск» і мужчынскай нацыянальнай каманды Расціслаў Вяргун. За Трафімаву свае галасы аддалі 65 апытаных, за Вергуна — 69.

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Хакеісты мінскага «Дынама» завяршылі год перамогай над магнітагорскім «Металургам» з вынікам 1:0 (1:0, 0:0, 0:0) у матчы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі. Пасля 44 праведзеных сустрэч «зубры» набралі 50 балаў і знаходзяцца на восьмым месцы ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі.



**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

---

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 17.02 | 7.34 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.52 | 7.34 |
| Гомель — | 9.06 | 16.57 | 7.51 |
| Гродна — | 9.41 | 17.19 | 7.38 |
| Брэст — | 9.34 | 17.27 | 7.53 |

### Месяц

*Апошняя квадра 27 снежня.*
*Месяц у сузор'і Вадалія.*

### Імяніны

*Пр. Настассі, Фёдара, Тэадора, Дзмітрыя.*
*К. Ангеліны, Ганны, Кірылы, Мяфодзія.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




---

**Даты | Падзеі | Людзі**

### 4 СТУДЗЕНЯ

**У краіне**

**1729** год — нарадзіўся (в. Ясянец, цяпер у Баранавіцкім раёне) Іахім Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф, публіцыст, паэт і перакладчык. З 1765 года — маршалак Галоўнага трыбунала ВКЛ, з 1773-га — падканцлер літоўскі, адзін з арганізатараў і членаў Адукацыйнай камісіі. Кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім, міністр замежных спраў з 1791 года, канцлер ВКЛ — з 1793-га. У сваім маёнтку ў Шчорсах замяніў паншчыну чыншам, пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў бібліятэку з архівам.



**1835** год — нарадзіўся (в. Пукава Слуцкага павета) Вітольд Аляксандравіч Наркевіч-Ёдка, беларускі ўрач-афтальмолаг, доктар медыцыны. Аўтар каля 80 навуковых прац у галіне вочных хвароб. З 1883 года жыў у сваім маёнтку Бабоўня (цяпер Капыльскі раён), займаўся сельскай гаспадаркай, праводзіў аперацыі ў арганізаванай ім тут лякарні.

**1869** год — нарадзіўся (в. Добасна, цяпер у Кіраўскім раёне) Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі), беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў новай беларускай прозы. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. У 1890 годзе за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях арыштаваны, выключаны з універсітэта. Пасля вяртання ў Беларусь працаваў у Радашковічах. Пасля пераехаў з сям'ёй у фальварак Карпілаўка, дзе правёў большую частку жыцця. У 1909—1910 гадах — у Вільні, працаваў у газетах «Наша ніва», «Беларус», часопісах «Саха», «Лучынка». Таксама быў намеснікам старшыні Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка», «Васількі», паэмы «Дзед Завала», кнігі «Успаміны», няскончанага рамана «Золата».

**1912** год — нарадзіўся (г. Чавусы) Сцяпан Парфёнавіч Маргунскі, беларускі правазнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар юрыдычных навук, прафесар. Аўтар больш як 70 навуковых прац па праблемах тэорыі і гісторыі станаўлення і развіцця беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржаўнасці, суаднасін нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў дзяржаўным будаўніцтве БССР. Пад яго кіраўніцтвам выдадзена «Гісторыя дзяржавы і права Беларускай ССР».

**У свеце**

**1643** год — нарадзіўся Ісаак Ньютан, англійскі фізік, матэматык, астраном, філосаф, тэолаг.

**1850** год — пасля інсцэніроўкі расстрэлу асуджаным петрашэўцам, уключаючы Ф. М. Дастаеўскага, абвешчана аб памілаванні.

**1919** год — у Савецкай Расіі прыняты закон аб праве на альтэрнатыўную вайсковую службу для шэрагу рэлігійных меншасцяў.

**1930** год — была апублікавана кніга К. Э. Цыялкоўскага «Рэактыўны аэраплан», у якой вучоны абгрунтаваў выкарыстанне ракетных рухавікоў у авіяцыі: «За эрай аэрапланаў вінтавых павінна ісці эра аэрапланаў рэактыўных».

**Так гаварыў...**

**МАКСІМ ТАНК:**

*«Самая страшная рэч — абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як дрыгва, можа загубіць любога чалаевка».*

---

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі стары год праводзіць недастаткова добра, ён можа паўтарыцца.**

Калі ёлку ўпрыгожылі, тады і Новы год.

**— У каго-небудзь дома ёсць што паесці? А то ў нас усё на Новы год.**

Размаўляюць дзве сяброўкі:

— Каб выйсці замуж, трэба Новы год сустракаць у белым.

— Але белы колер таўсціць!

— Ты хочаш застацца стройнай і незамужняй або быць поўнай, але замужам?

**Званок у службу тэхнічнай падтрымкі:**

**— У мяне камп'ютар не бачыць прынтар: я ўжо і манітор на яго павярнула, а ён усё роўна піша, што яго не бачыць. Што рабіць?**

**— Пальцам паказвалі?**




anekdot.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 65.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12